№ 15 (660) 21 красавіка 2010

www.nn.by

незалежная газета

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Аднаўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады

**Гіпермаркеты таксама падманваюць**

Старонка 4



**Дастыш фантастыш**

Старонка 11



**Міністр Латушка заказаў «Шэўрале» за 100 тысяч еўра**

Старонка 11




## У НУМАРЫ

**«Мы на каленях стаялі, выпрошваючы грошы»**

Падчас штогадовага паслання да народа і парламента Лукашэнка паабяцаў далейшую эканамічную лібералізацыю, а таксама пляжыў Расію. **Старонка 3.**

**Янкі точаць зубы на наш уран**

Сіндром абложанай крэпасці — так можна сцісла адкаментаваць апошнія выказванні Лукашэнкі. Піша Аляксандр Класкоўскі. **Старонка 7**.

**Попел на нашых галовах**

Вулканічная актыўнасць — новы выклік для Еўропы. **Старонка 5.**

**Думалі — маньяк, аказалася — сябар**

Крымінал — **старонка 6**.

**Айчына кантрабанда**

Ашмянскія цёткі ніколі не спяць. Павал Касцюкевіч. Апавяданне. **Старонка 13.**


«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2**.

# Выклік Маскве: Бакіеў у Мінску

Лукашэнка: «Гэта маё асабістае рашэнне як кіраўніка дзяржавы». **Старонка 2.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Курманбек Бакіеў. Джалалабалская вобласць, 13 красавіка.**




СЯМЁН ПЕЧАНКО

**Начальства дэманструе звышзаробкі**

Выбары — рэдкі выпадак, калі можна зазірнуць у дэкларацыі пра даходы. **Старонка 9.**

# Баі мясцовага значэння

25 красавіка ў Беларусі адбудуцца мясцовыя выбары.

Гэтыя выбары стануць першымі, што пройдуць па новым заканадаўстве. На мясцовых выбарах адмененая абавязковая планка ў 50% тых, хто прыйдзе на галасаванне. Г.зн. байкот мае толькі палітычны, а не юрыдычны сэнс. Дэпутаты ўсё адно будуць абраныя. Другога тура таксама не будзе: усе народныя абраннікі стануць вядомыя ўжо ў гэтую нядзелю.

У параўнанні з выбарамі трохгадовай даўніны нязначна ўзрос конкурс на адно месца. На 21 301 дэпутацкі мандат прэтэндуюць 25 033 кандыдаты. То бок сярэдні конкурс па краіне складзе 1,17 чалавека на месца, а ў 2007 годзе ён складаў усяго 1,05.

На мінулых выбарах безальтэрнатыўнымі былі 95% акругаў, цяпер усяго толькі 85%. Асаблівы ж разгул дэмакратыі назіраецца ў Мінску — 3,9 чалавека на месца.

Абсалютна савецкая безальтэрнатыўнасць назіраецца на большасці ўчасткаў, дзе выбіраюцца дэпутаты ў сельсаветы.

Нягледзячы на скепсіс адносна выбараў — галасуй ні галасуй... — апазіцыя вылучыла больш за 400 сваіх кандыдатаў. Беларуская партыя левых «Справядлівы свет» — 99, Беларуская хрысціянская дэмакратыя — 82, Аб'яднаная грамадзянская партыя — 77, Рух «За Свабоду» — 65, Партыя БНФ — 33, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя — 29, «Правы альянс» — 5, Беларуская сацыял-дэмакратычная грамада — 2. Але вылучэнцы ад апазіцыі складаюць усяго толькі 1,5% ад агульнай колькасці зарэгістраваных.

**Псеўдаальтэрнатыўнасць.** Новая тэхналогія лукашэнкаўцаў: кандыдаты–начальнікі маюць спарынг–партнёрак медсясцёр і прадаўшчыц.

Тры гады таму ад апазіцыі вылучалася 230 чалавек, і ў мясцовыя саветы яны змаглі правесці не больш за дзясятак чалавек. Перамаглі Аляксандр Агееў у Магілёве, Зміцер Кухлей — у Мастах.

У 2003, калі ад апазіцыі ішло блізу тысячы чалавек, і вынік быў зусім іншы. Дэпутатамі сталі больш за сотню чалавек. З той кампаніі ў палітыку стартавалі Алесь Міхалевіч, Юрась Губарэвіч, Алесь Зарэмбюк, Сяргей Салаш, якія змаглі вырасці ў моцных нацыянальных і рэгіянальных лідэраў.

**Працяг на старонцы 8.**

# Выклік Маскве: Бакіеў у Мінску

**«Гэта маё асабістае рашэнне як кіраўніка дзяржавы».**

Экс-прэзідэнт Кыргызстана Курманбек Бакіеў знаходзіцца ў Мінску. Пра гэта заявіў Аляксандр Лукашэнка, адказваючы на пытанні дэпутатаў 20 красавіка. «У панядзелак Бакіеў быў у Мінску, яму прызначана медыцынскае абследаванне», — сказаў ён.

Лукашэнка таксама дадаў, што разам з Бакіевым знаходзяцца яго родныя — усяго чатыры чалавекі.

7 красавіка Бакіеў быў зрынуты з пасады кіраўніка Кыргызстана. Адразу ён з'ехаў на поўдзень краіны, дзе знаходзіцца ягоны родавы аул. Але ніхто гарантаваць бяспеку экс-прэзідэнту не мог. 15 красавіка Бакіеў вылецеў у Казахстан, але ўсе разумелі, што гэта часовы прыстанак.

У панядзелак, 19 красавіка, прадстаўнік МЗС Казахстана Аскар Абдрахманаў паведаміў, што экс-кіраўнік Кыргызстана Курманбек Бакіеў пакінуў Казахстан.

Яшчэ ў нядзелю, 18 красавіка, Аляксандр Лукашэнка заявіў, што гатовы прыняць Бакіева ў Мінску: «Гэта маё асабістае рашэнне як кіраўніка дзяржавы».

«Я хачу звярнуцца да кіргізскага народа: не дапусціце здрады свайму прэзідэнту. Гэта будзе самай жорсткай памылкай», — зазначыў Лукашэнка.

Лукашэнка назваў падзеі ў Кыргызстане «антыканстытуцыйным пераваротам» і абвінаваціў ЗША і Расію ў спрыянні яму.

Рашэнне прыняць Бакіева ў Беларусі, імаверна, выкліча новае абвастрэнне адносін з Расіяй. У адрозненне ад Аскара Акаева, які знайшоў сабе прытулак у Маскве, Курманбек Бакіеў не мог на такое разлічваць. Масква не магла дараваць яму падман у пытанні вываду амерыканскай вайсковай базы, за які ён ужо атрымаў шчодры куш ад Крамля.

Сітуацыя ў самой Кіргізіі застаецца напружанай. У панядзелак у Бішкеку ў міжэтнічных канфліктах загінулі прынамсі 5 чалавек. Гэтак скончылася спроба беззямельных самасёлаў захапіць сядзібы туркаў. У Кіргізіі туркі, кітайцы, расійцы і габрэі кантралююць бізнэс, што выклікае гнеў кіргізаў.

У той жа дзень міліцыянты дабіліся адстаўкі міністра ўнутраных справаў часовага ўрада. Джалалабадская вобласць жа ўвогуле захоўвае вернасць Бакіеву. Ягоны ад'езд у Беларусь можа зняць звязаныя з ім надзеі.

Учора ж у Бішкеку адбыўся пікет пратэсту супраць гатоўнасці Беларусі прыняць апальнага прэзідэнта.

**Мікола Бугай**


PHOTO.BYMEDIA.NET
**Узброеныя прыхільнікі Бакіева ў Джалалабадзе.**

**З каторай жонкай і каторымі дзецьмі Бакіеў прыляцеў у Беларусь?**
Аляксандр Лукашэнка згадаў пяцігадовага сына і дзевяцігадовую дачку Бакіева, якія прыляцелі ў Беларусь разам з ім. Між тым ад законнай жонкі, Тацяны Віктараўны Бакіевай, якая нарадзілася ў Самары, у Бакіева два дарослыя сыны, аднаго з якіх Бакіеў рыхтаваў у пераемнікі.

Адкуль жа ўзяліся непаўналетнія дзеці?
Чуткі пра дзве неафіцыйныя сям'і Бакіева хадзілі ў Бішкеку даўно. Былы міністр дзяржмаёмасці краіны нават звярнуўся да Бакіева з адкрытым лістом, у якім заклікаў не парушаць маральных нормаў.

## «Яндэкс» збеларусіўся

**Раней «Яндэкс» меў толькі расійскую і ўкраінскую версіі.**

Карыстальнікі папулярнага расійскага пошукавіка «Яндэкс» цяпер могуць бачыць галоўную старонку партала і па-беларуску. Раней «Яндэкс» меў толькі расійскую і ўкраінскую версіі.

З разынак лакалізацыі — слоўцы кшталту «мапа», «малюначкі», «лісты», з памылак — «пробкі».

«Яндэкс» не паленаваўся распрацаваць адмысловыя тэмы афармлення: з бусламі, якія лятуць над плошчай Перамогі, ля якой пасвяцца зубры; і з ручніком з нацыянальным арнаментам па краях і з полем пошуку пасярэдзіне.

Вынікі пошуку «Яндэкс» можа адфільтраваць так, каб у іх была толькі беларуская мова.

**Cz**

## Самае чытанае на nn.by за 14—20 красавіка

- «К нам тут ветераны приходят, плачут»
- СААЗ заклікае не выходзіць з хатаў у часе дажджоў з попелам + мапы руху хмары
- У Магілёве ў аўтаавары загінула 17-гадовая дзяўчына + фоты
- «Шэўрале» Купалы коштам 100 тысяч еўра
- Літва адмовілася Беларусь называць Belarus
- «Толькі народ мае права спытаць з прэзідэнта. Ніякія банды, ніякія групы, ніякая апазіцыя»
- Выступ Францішка Вячоркі перад выбаршчыкамі ў Мазыры
- «Чарнобыльскі шлях — 2010» падзяліў апазіцыю
- Пытанні Лукашэнку перадалі праз БРСМ
- Сэкс з непаўналетняй: скандал у французскай футбольнай зборнай

## nn@nn.by

Чым здымаць такі фільм пра Вітаўта (№14), лепш не здымаць ніякага. Фільм пра нацыяныльнага героя павінен быць грандыёзны.

**Аляксандр**

## СЦІСЛА

### Не прызнаў віны

У Вярхоўным судзе працягваецца разгляд крымінальнай справы ваўкавыскіх прадпрымальнікаў. Суд пачаў слухаць апошнія словы абвінавачаных. Мікалай Аўтуховіч не прызнаў сваёй віны і заявіў, што гэты працэс — працяг пераследу, што пачаўся ў 2003 годзе, і ў якім зацікаўленыя высокія чыноўнікі. Іх абвінавачваюць у падрыхтоўцы тэрарыстычнага акта і арганізацыі падпалу дома чыноўніка. Праваабаронцы лічаць справу палітычна матываванай.

### Ад чацвярга — пахаладанне

Ад чацвярга 22 красавіка паўночнаатлантычны цыклон, які апусціцца на Скандынавію, будзе скіроўваць на тэрыторыю Беларусі халодныя паветраныя масы з паўночнай Атлантыкі. Будуць ісці дажджы, а ноччу па поўначы верагодны мокры снег. Тэмпература паветра ўдзень не будзе перавышаць 5—12 градусаў цяпла. Пацяпленне чакаецца толькі ад нядзелі.

### Ляпісы на «Басовішчы»?

Усё ідзе да таго, што хэдлайнерам сёлетняга «Басовішча» будзе «Ляпіс Трубяцкой». Арганізатары фестывалю завяршаюць перамовы з гуртам. «Басовішча» пройдзе 16—17 ліпеня пад Гарадком, што на Беласточчыне.

### Беларусаў арыштавалі па запыце ФБР

У Чэхіі і Беларусі арыштаваныя двое грамадзян Беларусі — Дзмітрый Наскавец і Сяргей Сямашка. Паводле следства, арыштаваныя стварылі вэбсайт, які прапаноўваў паслугі інтэрнэт-ашуканцам, якія выкарыстоўваюць скрадзеныя банкаўскія звесткі і нумары крэдытных картак.

**СМ**

# Не ўсё ў жыцці апошні раз

**Падпісацца можна праз Рэдакцыю і праз «Белпошту». Мы рэкамендуем — праз Рэдакцыю**

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Усе тыя, каго такі спосаб атрымання газеты задавальняе, хай застаюцца вернымі такой падпісцы.

Мы зможам дастаўляць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце. Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

ПАВЕДАМЛЕННЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

| Рахунак атрымальніка | 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак | |
|---|---|---|---|

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |

Агулам

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Мінск, код 764

| Рахунак атрымальніка | 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак | |
|---|---|---|---|

(прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|
| За газету "Наша Ніва" | | | | |

КВІТАНЦЫЯ

Агулам

Касір М.П.

**Каб штотыдзень атрымліваць газету,** дасылайце адрасы і грошы за газету. Кошт на месяц — 6 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газету **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага перdesignated перaказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

# Дзякуй

**падпісчыкам, якія падпісваюцца праз рэдакцыю**

М.Б. з Полацка.
Л.Ш. з Віцебска.
Мікалаю Р. з Бярозаўскага раёна.
Т.К. са Смалявіцкага раёна.
Е.С., Л.М. з Магілёва.
Сяргею С. з Баранавіцкага раёна.
А.З. з Пружанскага раёна.
Л.П. з Брэста.
Мікалаю Т. з Асіповіцкага раёна.
Уладзіміру Ц. з Лагойскага раёна.
М.Б. са Светлагорскага раёна.
Алене Б., Уладзіміру Ф. з Гомеля.
І.Л. са Стаўбцоўскага раёна.
Вользе Б. са Столінскага раёна.
А.Р. з Мастоўскага раёна.
Валерыю Х., Сяргею К. з Салігорскага раёна.

# Лукашэнка: Мы на каленях стаялі, выпрошваючы грошы

**Падчас штогадовага паслання да народа і парламента Лукашэнка быў суровы. Ён абяцаў далейшую эканамічную лібералізацыю, а таксама пляжыў Расію.**




**Пасланне Лукашэнкі слухалі ўсе найвышэйшыя чыноўнікі.**

Трансляцыя з Авальнай залы парламента пачалася ў той момант, калі Лукашэнкі за трыбунай яшчэ не было. Аператары адвольна выхоплівалі тых, хто збіраўся слухаць ужывую. Прэм'ер Сідорскі размаўляў са старшынёй Канстытуцыйнага суда Пятром Міклашэвічам. Гледачы маглі пабачыць у новым іміджы старшыню прэзідыума Акадэміі навук Міхаіла Мясніковіча, які адгадаваў бараду-эспаньёлку. Звярнула ўвагу, што міністр інфармацыі Алег Праляскоўскі і старшыня Белтэлерадыёкампаніі Аляксандр Зімоўскі сядзелі на першых шэрагах, а вось міністры адукацыі і культуры Аляксандр Радзькоў і Павел Латушка — на галёрцы.

Лукашэнка традыцыйна пачаў з эканамічнага блока. Пачынаў чытаць па паперцы. Кіраўнік дзяржавы зноў гаварыў пра эканамічную лібералізацыю.

Найперш ён загадаў даць зялёнае святло для замежных інвестараў. «Чаму яны прыходзяць сустракацца асабіста са мной? Бо згубілі веру ў тых, хто ніжэй. Адмовы інвестарам будуць успрымацца як сабатаж», — зазначыў кіраўнік дзяржавы.

Ён спытаў кіраўніка Адміністрацыі Уладзіміра Макея за бюракратыю, чаму ёй не ўдаецца даць рады. У якасці прыклада прывёў выпадак з транспартна-лагістычным цэнтрам у аэрапорце, дазвол на будаўніцтва якога кампанія не магла атрымаць цягам 2,5 года.

Лукашэнка паставіў амбітную задачу: бліжэйшым часам выйсці ў трыццатку краін з найбольш спрыяльнымі ўмовамі для прадпрымальніцкай дзейнасці. «Арандатары павінны адчуць палёгку. Да восені павінна адбыцца спрашчэнне падатковай сістэмы. Крэдыты ў банках павінны быць даступнымі», — вяшчаў з трыбуны лідэр.

Кіраўнік краіны настойвае на працягненні праграмы меліярацыі зямель, што, на ягоную думку, можа павысіць даходы дзяржавы ад сельскай гаспадаркі з трох мільярдаў даляраў да сямі.

Яшчэ адной з пастаўленых задач з'яўляецца ўваходжанне Беларусі ў топ-50 краін з найвышэйшым індэксам чалавечага патэнцыялу.

«Мы на каленях стаялі перад некаторымі арганізацыямі, выпрошваючы грошы, — сказаў Лукашэнка, яўна маючы на ўвазе МВФ. — Цяпер нам іх дапамога ўжо не патрэбная».

Асабліва на арэхі дасталася будаўнічай сферы. На думку Лукашэнкі, цэны ў гэтай галіне завышаныя, а канчатковы прадукт не адпавядае нормам. «Прыйдзе дзяржкантроль і здыме з вас штаны. І выкіне на вуліцу без штаноў», — папярэдзіў ён будаўнікоў.

Блок пра культуру быў традыцыйным. Лукашэнка патрабаваў новых шэдэўраў. «Я прашу, дайце мне «Вайну і мір», дайце «Паднятую цаліну», я вам за гэта заплачу. Няма ні вайны, ні міру».

Двухмоўе было названае вялізнай каштоўнасцю, а гвалтоўнай беларусізацыі — не будзе.

Пасля культуры пачалася гаворка пра замежнапалітычнае становішча краіны. «Расія, безумоўна, застаецца нашым асноўным партнёрам, — традыцыйна пачаў Лукашэнка. — Мы падпісвалі сотні дамоваў з Расіяй. І нам пляскалі ў Крамлі. Цяперашняе ж кіраўніцтва Расіі пайшло на так званую прагматызацыю адносінаў. Уведзеныя мыты на нафту. Усё гэта падрывае падмуркі саюзнай дзяржавы. Нас выдушвалі з расійскага рынку».

Тым не менш, лідэр Беларусі не адчайваецца. «Нафта амаль у два разы падаражала. Нам даюць 6 мільёнаў тонаў, але нашы заводы штогод перапрацоўваюць 22—25 мільёнаў тонаў. І што, цяпер трэба спыніць заводы? Я еду дамаўляцца па нафце. Ужо пайшла нафта з Венесуэлы, пачалі здабываць у Іране. А чаму мы гэта не можам рабіць у Расіі? З нас смяюцца, што мы вязём нафту праз акіян. Я ўсё даўно пралічыў. Калі б нам гэта выгадна не было, то ніхто б не вазіў».

«Нахіляць, даваць выспяткі сабе я не дазволю. Калі нахіляюць мяне, то нахіляюць увесь беларускі народ. Кіраўніцтва Расіі думае, што мы нікуды не дзенемся. Дзенемся. У цэнтры Еўропы краіна пуставаць не будзе. Я не магу дазволіць сабе прыніжаць уласны народ», — кажа Лукашэнка.

«Я не Расіі мушу дзякаваць, а сваім «ворагам» з МВФ, Еўропы, Захаду, што нам грошы далі, каб мы выжылі. Мы прайшлі ўжо той пункт, калі нас могуць паставіць на калені. Расія, калі згубіць Беларусь, згубіць свой прывабны выгляд. Ніхто Расіі болей не паверыць. Я не хачу канфрантацыі з Расіяй. Мы яшчэ не разышліся канчаткова, яшчэ не позна вярнуцца. Але ад залежнасці і дыктату мы павінны сысці», — зазначыў ён.

Лукашэнка задаволены «адкрытым і прадметным» дыялогам з Еўрасаюзам. Асабліва рады, што яго ініцыююць такія краіны, як Францыя, Германія, Італія. Узгадаў Лукашэнка і пра «Еўранэст». Ён зазначыў, што там павінны быць дэпутаты парламента, а не апазіцыянеры. Пакрыўджаны лідэр дзяржавы быў за тое, што Беларусь не запрасілі ў Вашынгтон на саміт па ядзернай бяспецы. «Не запрасілі, бо не станцавалі пад дудку ЗША і Расіі. Расіяне паабяцалі амерыканцам, што вывезуць адсюль уран. Нічога яны адсюль не вывезуць. Брудныя ядзерныя бомбы мы ствараць не будзем». Калі атамную станцыю адмовяцца будаваць расійцы, то пойдзем у Кітай, зазначыў Лукашэнка.

Было ў выступе і пра апазіцыю. Пра Казуліна было зазначана: «Няхай радуецца, што вызвалілі, сядзіць і не вякае».

«Не зусім добра, калі Пяткевіч і Зімоўскі камунікуюць паміж сабой праз інтэрнэт. Але і ён, і яна маюць рацыю. Лепш сустрэнецеся асабіста і пагаварыце. Але такая спрэчка таксама надае новы каларыт», — адгукнуўся Лукашэнка на нядаўнюю дыскусію паміж чыноўнікамі аб ролі ідэалогіі.

Агулам выступ доўжыўся больш за тры гадзіны.

**Зміцер Панкавец**

## БТ паказала «Катынь» па-беларуску

**Аказалася, Белтэлерадыёкампанія пераклала фільм Вайды яшчэ ў 2009 годзе.**

18 красавіка, у дзень пахавання прэзідэнта Польшчы, на Першым нацыянальным паказалі фільм Анджэя Вайды «Катынь». Рэдкі для БТ выпадак: гэты фільм дэманстраваўся па-беларуску. Перакладзеныя былі нават рэплікі савецкіх карнікаў з НКВД, якія ў арыгінале гавораць па-расійску.

Пераклад «Катыні», як было паведамлена пры канцы фільма, аддзел дубляжа галоўнай дырэкцыі ліцэнзійных праграм і кінапаказу Белтэлерадыёкампаніі зрабіў яшчэ ў 2009 годзе. Але дагэтуль па беларускіх каналах фільм не паказвалі. Як ён быў негалосна забаронены і на расійскіх. Дый гэтаму паказу па БТ папярэднічаў шэраг непаслядоўных дзеянняў тэлерадыёкампаніі.

Так, 11 красавіка, у сувязі з трагічнымі падзеямі пад Смаленскам, «Катынь» паказалі на тэлеканале «Расія». А на тэлеканале «РТР-Беларусь», які дублюе «Расію», у гэты час дэманстравалі забаўляльную перадачу «Танцы з зоркамі». Пазней з'явілася паведамленне, што БТ усё ж пакажа «Катынь» 23 красавіка апоўначы. І нарэшце, пасля таго як Лукашэнка «рэкамендаваў» тэлеканалам абмежаваць забаўляльныя перадачы ў дзень пахавання Качынскіх, стала вядома пра змены ў праграме вяшчання БТ. Паказ «Катыні» быў прызначаны на 18 красавіка.

Паказу папярэднічала прадмова-дыскусія з удзелам кінакрытыкаў і пісьменнікаў. Яны разважалі пра гістарычную праўду. З галоўнага экрана краіны прагучала, што ў Катыні былі расстраляныя і беларусы. Таму ўсе ўдзельнікі па чарзе адзначылі пераклад на беларускую мову як сімвалічны акт. Мікалай Чаргінец, які браў удзел у перадачы, на гэта зазначыў, што «ў нас дзве дзяржаўныя мовы», а чатыром сотням тысяч этнічных палякаў у Беларусі беларуская, магчыма, будзе больш зразумелая.

Адзіная заўвага, якая магла ўзнікнуць у гледачоў падчас нядзельнага паказу, гэта рэкламны блок — адзіны за ўвесь фільм, але ўстаўлены акурат пасярод фінальнай сцэны расстрэлаў у Катыні.

Тым, хто не змог пабачыць фільм у нядзелю: паказ драмы, згодна праграмы перадач, запланаваны на 23 красавіка на Першым нацыянальным у 00.00.

**Сямён Печанко**



## Пастанову падпісаў асабіста Корж

**Супраць Алеся Зарамбюка заведзеная крымінальная справа.**

На каардынатара Руху «За Свабоду» па Гродзенскай вобласці Алеся Зарамбюка заведзеная крымінальная справа. Яе распачало Гродзенскае ўпраўленне КДБ. Падпісваў пастанову асабіста кіраўнік упраўлення Іван Корж, які запомніўся ціскам на апазіцыянераў у Гомельскай вобласці.

Алеся Зарамбюка абвінавачваюць у махлярстве. Нібыта ён незаконна атрымліваў грошы ад грамадзян, а ўзамен абяцаў дапамогу пры атрыманні шэнгенскіх візаў.

16 красавіка кадэбісты правялі ператрусы дома ў Алеся, а таксама ў ягоных бацькоў. А на наступны дзень Зарамбюку была зачытаная пастанова аб завядзенні крымінальнай справы.

Сам Зарамбюк лічыць, што гэты пераслед звязаны з ягоным удзелам у мясцовых выбарах, а такім чынам гарадскія ўлады хочуць пазбавіцца ад нязручнага кандыдата.

У Алеся ўзятая падпіска аб нявыездзе з краіны.

**ЗП**

## СЦІСЛА

### «Чарнобыльскі шлях» падзяліў апазіцыю

Традыцыйную акцыю арганізоўвае Беларуская хрысціянская дэмакратыя, «Малады фронт» і «Еўрапейская кааліцыя». А вось Партыя БНФ ад удзелу адмовілася. Мінгарвыканкам дазволіў на 26 красавіка шэсце па маршруце ад Акадэміі навук да Чарнобыльскай капліцы, што на вуліцы Карастаянавай.

### Сурвіла пераабраная старшынёй Рады БНР

У Лондане прайшла 27-я сесія Рады Беларускай Народнай Рэспублікі. У адпаведнасці са Статутам Рады, адбыліся выбары кіраўніцтва. Старшынёй Рады БНР пераабраная Івонка Сурвіла, якая кіруе Радай ад 1997 года.

### Суд над Каваленкам перанеслі

20 красавіка ў Віцебску павінен быў пачацца судовы працэс па крымінальнай справе над актывістам партыі КХП-БНФ Сяргеем Каваленкам. Працэс быў перанесены, бо заняты суддзя Яўген Буруноў. Каваленка адразу ж зладзіў акцыю з бел-чырвона-белым сцягам на ганку суда. Яго затрымлівалі чацвёра амапаўцаў. Калі Каваленка быў у пастарунку, нехта вывесіў бел-чырвона-белы сцяг над райаддзелам міліцыі.

**АП, ЗП**

# Крэдыт не бяруць, каб падымаць заробкі

Урад чакае рост ВУП на 6% за паўгода і не хоча абцяжарвацца абавязацельствамі перад МВФ узамен за новы крэдыт.

Перад беларускімі ўладамі стаяла дылема: ці браць чарговую порцыю МВФаўскіх грошай, ці не. Падобна, яна вырашаецца на карысць адмовы ад далейшага супрацоўніцтва.

Ранейшыя выказванні чыноўнікаў дазвалялі меркаваць, што ўлада схільная ўзяць грошы. Але цяпер міністр фінансаў Андрэй Харкавец адкрыта заявіў: «Відавочнай патрэбы для Беларусі ў новай праграме «стэнд-бай» МВФ няма». Маўляў, папярэдняя праграма Міжнароднага валютнага фонду адыграла сваю станоўчую ролю, але з таго часу многае змянілася. «Сітуацыя ў эканоміцы сёння стабільнейшая, бюджэт выконваецца ў тых параметрах, якія мы чакалі, ідзе паступальны рост эканомікі», — сказаў міністр.

Аптымізму яму дадаў і Белстат, які падлічыў рост ВУП у першым квартале. Аказалася — плюс 4% проці леташняга паказчыка. На радасцях Міністэрства эканомікі паабяцала да канца паўгоддзя нарасціць ВУП да 6%. Якія лічбы будуць у канцы года, меркаваць складана. Разбежка складае ад 12%, якіх патрабуе Лукашэнка, да 2,4%, што прадказвае МВФ.

### МВФ перашкаджае заробку $500

Міжнародны валютны фонд, пры ўсёй гатоўнасці выдаць Беларусі крэдыт, запатрабаваў бы няўхільнага выканання абавязацельстваў. І галоўнае – абмежаваў бы папулісцкі рост заробкаў беларусаў да $500 у перадвыбарны год. Пакуль што сярэднестатыстычны беларускі работнік зарабляе $348.

Паказчыка $500 дасягнуць рэальна, але такое надзіманне заробкаў парушае гаспадарчы баланс.

А пакуль іншыя паказчыкі эканамічнага развіцця пачынаюць вяртацца да перадДэвальвацыйнага ўзроўню. Ад 19 красавіка Нацбанк паменшыў памер стаўкі рэфінансавання на 0,5%. Цяпер яна будзе складаць 12,5%. Перад змрочным 2 студзеня 2009 года стаўка была роўная 12%.

Што зменіцца ўслед за гэтым рашэннем? Стануць больш даступнымі крэдыты, працэнт якіх змяшчае ў сабе стаўку рэфінансавання, але паменшацца і стаўкі ўкладаў.

Тым не менш, паказчык рэфінансавання ўсё роўна адстае ад тых, што былі зафіксаваныя ў прагнозных дакументах. У Праграме развіцця банкаўскага сектара эканомікі Беларусі на 2006—2010 гады было пазначана, што ў канцы 2010 года стаўка рэфінансавання будзе складаць 4—6%.

**Яўген Васількоў**

# Гіпермаркеты таксама падманваюць

Дробныя сакрэты вялікага гандлю.

Абважыць на рынку, не прабіць чэк ці недадаць рэшту — гэтыя хітрыкі прадаўцоў заўсёды будуць актуальнымі. Размова ж пойдзе пра тыя непрыемныя сітуацыі, якія падманам назваць нельга. Так, простая лёгкасць рук. Калі трэба быць асабліва пільным і на што звяртаць дадатковую ўвагу ў супер- і гіпермаркетах?

### Мастацтва малых памераў

Савецкі час быў часам круглых лікаў. Хлеб — дык 1 кілаграм, смятана — 250 грамаў ці 500 грамаў... Такая фасоўка пратрымалася да пачатку новага тысячагоддзя. А пасля ў справу ўмяшаліся маркетолагі. Прыглядзіцеся: крупы цяпер прадаюцца ў пакетах па 0,9 кг замест ранейшага кілаграма. Смятану многія заводы прадаюць па 230 г, масла — па 180. Гандаль не пашкадаваў нават дзяцей — порцыя марожанага цяпер складае 65—75 г, а не колісь «законныя» 100 г. Эталонам хлеба стала з неба ўзятае 0,91 кг, а для паловы бохана 0,45 кг. Прычым фасоўка зменшылася, а тавары не патаннелі.

Хто трымаецца да апошняга, дык гэта знакамітая паўлітроўка. Што сокі, што піва з гарэлкай захоўваюць стандартную «камплектацыю». Літр — дык літр, 0,5 — дык 0,5.

### На калені па танны прадукт

На працу мерчандайзерам — спецыялістам па раскладанні тавару — бяруць каго хочаш, нават людзей без адукацыі. Затое галоўнага правіла гіпермаркетаў яны прытрымліваюцца бездакорна. Самыя танныя прадукты заўсёды павінны ляжаць на ніжніх паліцах.

Сацыёлагі падлічылі, што калі тавар перакласці на ўзровень вачэй, яго продажы ўзрастаюць на 70—80%. Таму перад пакупніком аказваюцца больш дарагія прадукты. Каб ашчаджаць, прыходзіцца аглядаць ніжнія паліцы на карачках.

### Чытанне між радкамі

«Маленькі крэдыт! Усяго 2% у месяц!» — захапляльная перспектыва для тых, хто чытае рэкламу няўважліва. Няхітрыя падлікі паказваюць, што 2% у месяц — гэта 24% гадавых. Хто адважыцца назваць такі крэдыт маленькім?

Часам інфармацыю і хаваць не трэба — яе ўсё роўна ніхто не зразумее. Што такое масліца? Масла, але не каровіна, а змяшанае са згушчанымі расліннымі алеямі. Тое ж датычыць і кефірных напояў, якія не з'яўляюцца кефірамі. І нектараў, у якіх насамрэч 25—50% соку, і сокаамяшчальных напояў, дзе ад соку застаецца ўсяго 10%.

Ніводны з пералічаных выпадкаў не з'яўляецца прамым парушэннем закону. Але, як у анекдоце, асадачак застаецца...

**ЯВ**



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Януковіч гандлюецца з Расіяй

Украіна хоча дабіцца зніжэння цаны газу ўзамен за саступкі ў пастаўках атамнага паліва.

Новы прэзідэнт Украіны пачынае выконваць перадвыбарныя абяцанкі. Адна з іх — паніжэнне цаны расійскага газу. Цяпер украінцы плацяць $337 за тысячу кубаметраў. Новая цана, па інфармацыі газеты «Коммерсант», складзе $250 ці нават $210. Страты Расіі ў такім выпадку будуць больш за $3 мільярды.

Якую кампенсацыю атрымае расійскі бок? Паводле розных меркаванняў, «Газпрому» могуць дазволіць арандаваць газавыя сховішчы ў Заходняй Украіне. Таксама Кіеў замовіць у Расіі пабудову двух новых блокаў Хмяльніцкай АЭС і адменіць кантракт з амерыканскім «Вестынгхаузам» на пастаўку атамнага паліва. Зноў-такі, на карысць расійскай дзяржаўнай атамнай кампаніі.

Размовы вядуцца таксама пра лёс флоту ў Крыме і авіяцыйных заводаў Украіны, што вырабляюць самалёты «Ан» і надта падабаюцца ўсходняму суседу.

**ЯВ**

# Спадар «Спадарожнік»

У гандлёвай сетцы «Мотавела» з'явіліся ровары, канцэптуальна аформленыя па-беларуску.

Яны рэкламуюцца слоганам «Спадарожнік — купі сабе ровар!». Прычым у слове «Спадарожнік» выразна вылучаецца першая частка — «спадар».

У мадэльным шэрагу прадстаўленыя як моладзевыя, так і класічныя ровары. У цэлым яны вылучаюцца перадавым дызайнам і палепшанай якасцю. Вырабляе іх не сам «Мотавела», а ААТ «Боракс».

Бел-чырвона-белая складная гарадская мадэль каштуе 752 тысячы рублёў.

**ЯВ**

## СЦІСЛА

### Танкер спазняецца

Венесуэльская нафта паступіць на Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод у першай дэкадзе мая. У канцы красавіка судна мае прыбыць у адэскі порт і далей чыгуначным транспартам — у Мазыр. Раней паведамлялася, што танкер прыбудзе ў Адэсу ўжо 23 красавіка.

### Інвестары не хочуць будаваць у Мінску арэндныя дамы

Будаўніцтва першага эксперыментальнага жылога дома, у якім кватэры будуць не выстаўляцца на продаж, а здавацца ў арэнду, адкладаецца. Для ажыццяўлення такіх планаў патрэбныя бюджэтныя сродкі, бо інвестыцыі акупяцца ўсяго праз 5—6 гадоў. Банк «Масква-Мінск» гатовы падключыцца да гэтага праекта.

### Двухпакаёўка патаннела на $1250

Сярэдні кошт квадратнага метра жылля ў Мінску пастаянна падае з пачатку сакавіка. За гэты час цана змянілася з $1455 да $1430. Такім чынам, сярэдняя двухпакаёўка плошчай 50 квадратных метраў патаннела на $1250.

### Падарунак кіргізам

Расія вырашыла выдзеліць Кыргызстану крэдыт у памеры $30 млн на развіццё сельскай гаспадаркі. Апроч таго, яшчэ $20 мільёнаў дадуць бязвыплатна на наўпростую сацыяльную падрымку насельніцтва.

### Adidas прыйдзе ў Беларусь

Кампанія Adidas адкрые афіцыйнае прадстаўніцтва ў Беларусі. Услед за гэтым у краіне з'явіцца шырокая сетка фірмовых крамаў.

**ЯВ**

# Наступствы Эйяф'ялайекюля:

## СААЗ заклікае не выходзіць з хатаў у часе дажджоў

Асабліва небяспечным вулканічны дождж можа быць для асобаў з хранічнымі рэспіраторнымі захворваннямі і астматыкаў, папярэджваюць дактары з Сусветнай арганізацыі аховы здароўя.

Попел збольшага крэмніевы, але ў ім прысутнічае таксама сера і фтор, злучэнні якіх могуць быць небяспечнымі для здароўя. Выкіды з ісландскіх вулканаў у мінулыя стагоддзі выклікалі паморкі бы́дла і людскія ахвяры ў Еўропе. Сёлетняе вывяржэнне пакуль не такое магутнае. Зрэшты, канца актыўнасці вулкана Эйяф'ялайекюль, што значыць па-ісландску «ледавіковыя горы вострава», пакуль не бачна. Цэлы тыдзень ён то прыгасаў, то раскачагарваўся.

Самым папулярным жартам у англамоўным свеце ў мінулую пятніцу стала: «Ісландцы, мы ў Вас прасілі cash (грошы), а Вы прыслалі нам ash (попел)» — з намёкам на надаўняе банкруцтва ісландскіх банкаў і адмову астраўлянаў сплаціць запазычанасці брытанскім і нідэрландскім укладчыкам.

### Як паўплывае вулкан на наша жыццё?

Мы будзем назіраць незвычайных колераў заходы сонца. А калі вывяржэнне зацягнецца, наступныя гады могуць стаць нязвыкла халоднымі. Ніякіх іншых непасрэдных рэакцый вулканолагі не прадбачаць.

### Першая згадка пра вывяржэнні вулканаў

у ісландскіх пісьмовых крыніцах трапляецца пад 1104. Тады вулкан Хекла разбурыў паселішчы вікінгаў у даліне Т'ёрсардалур. Тая ж Хекла нагадвала пра сябе ў 1300, 1341 і 1389. Вывяржэнні суправаджаліся моцнымі землятрусамі. У 1362 вулкан Араефаёкул знішчыў паселішча Літлахерад. Захаваліся звесткі пра вывяржэнне вулкана Катла ў 1660. Але самым катастрафічным стаў выбух вулкана Лакі ў 1783—1785. Тады ў Ісландыі загінула 10 000 чалавек — трэціна насельніцтва. Урад Даніі, якой тады належаў востраў, сур'ёзна меркаваў перасяліць рэшту ісландцаў на сейсмічна спакойную Ютландыю ля дацкага ўзбярэжжа.

**Мікола Бугай**

### ЖАРТ

Дагэтуль самым вядомым у свеце цяжкавымаўляльным словам было прозвішча прэзідэнта Ірана. Цяпер у Ахмадзінеджада з'явіўся такі ж выбухованебяспечны канкурэнт — вулкан Эйяф'ялайекюль.



Вулканічны пыл электрызуе паветра. Менавіта з ім звязваюць з'яўленне так званых агнёў святога Эльма на мачтах караблёў і крылах самалётаў. З тае ж прычыны ў вулкан часта сякуць маланкі. На фота: Эйяф'ялайекюль уначы.

# У вулканічную пастку трапіў і рэдактар «НН»



Вулкан паралізаваў і аэрапорт «Мінск-2».

Толькі 11 000 з 27 000 еўрапейскіх авіярэйсаў стартавалі ў пятніцу. Толькі 4 000 з 22 000 — у суботу.

Калі сядзіш дома, паралюш паветранага руху здаецца нечым далёкім. Калі за тысячы кіламетраў ад дому аказваешся заблакаваным сам, табе не да жартаў.

Я вяртаўся ў Беларусь з міжнароднай канферэнцыі з перасадкай у Франкфурце. На падлёце камандзір экіпажа пажартаваў хрэстаматыйна: маем дзве навіны, адну добрую, а другую кепскую. Наш самалёт прызямліцца ў 5.30 нармальна, але ад 6.00 аэрапорт зачыняецца ў сувязі з насоўваннем хмары вулканічнага попелу. Таму пасажырам транзітных рэйсаў трэба звярнуцца па дадатковую інфармацыю.

З улікам таго, што ў Франпорце, як яшчэ называюць гэты буйны аэравакзал, штогадзінна прызямляюцца дзясяткі рэйсаў, а папярэднія суткі туды кіравалі самалёты, што не маглі сесці ў Лондане ці Амстэрдаме, можаце ўявіць гармідар. У аэрапорце панавала разгубленасць. Супрацоўнікі «Люфтганзы» не ведалі, як можа развівацца сітуацыя. Спачатку масава перабранявалі білеты на пазнейшыя рэйсы. Гэта толькі блытала людзей. Пасля стала ясна, што блакада — не на дзень і не на два.

Агулам мне прыйшлося адстаяць 11 гадзінаў у чэргах, каб выменяць авіяквіток да Мінска на чыгуначны. Касіркі «Дойчэ бана» не былі гатовыя да такога наплыву. Мая даслоўна гадзіну не магла знайсці ў камп'ютары код горада Мінск.

Найбольш пацярпелі тыя, хто чакаў міжкантынентальных пералётаў. Уявіце: прыехаў чалавек у аэрапорт, віза сканчаецца, а часта і грошай вобмаль, дома шмат справаў. І тут ты захрасаеш у аэрапорце. Драма! Чалавеку, змучанаму пералётам, знерванаму падарожжам, цяжка гэта перанесці. Паважныя англічане пачыналі біцца ў істэрыцы, пачуўшы ад супрацоўнікаў чыгункі, што ўсе білеты да туманнага Альбіёна на наступныя тры дні распрададзеныя.

Некалькі чалавек пры мне ў чэргах самлелі. Тады супрацоўнікі аэрапорта пачалі раздаваць ваду і салодкія батончыкі. Тым, хто заставаўся чакаць, даставаліся таксама ваўчары на абеды і адпачынак.

Самае прыкрае для пасажыраў і перавозчыкаў — ніхто не можа дакладна спрагназаваць рух хмары і час перапынку ў руху.

У чарзе побач са мною стаяла пара габрэяў-пенсіянераў з Амерыкі (мама спадара нарадзілася, як аказалася, у Віцебску). Яны ляцелі на адпачынак у Стамбул, даляцелі толькі да месца перасадкі. Пасля трансатлантычнага пералёту яны ледзьве трымаліся на нагах... Паспрабавалі замовіць гатэль і чакаць лётнай пагоды. Аказалася, усе гатэлі запоўненыя наведнікамі традыцыйнага Франкфурцкага кірмаша ды ўчарашнімі транзітнымі пасажырамі. Месц няма. Так і не ведаю, што яны вырашылі.

Авіякампаніі трацілі прыбытак, таму пачалі настойваць на бяспечнасці палётаў скрозь попел. Але рэгуляваннем паветранай прасторы займаюцца дзяржаўныя структуры, а яны, як і ўсе дзяржструктуры, перастрахоўваюцца: а не дай бог які самалёт упадзе. Тым больш што попел выразна пашкодзіў знішчальнікі НАТО, якія трапілі ў хмару на самым пачатку вывяржэння.

Вось так Еўропа адчула, наколькі сучасная тэхніка і эканоміка залежаць ад капрызаў прыроды.

Мой багаж застаўся ў Франкфурце. Калі яго даставяць дамоў, аднаму Одыну ведама. Плакалі заморскія слодычы, якія я накупляў дзецям. Але прабіўшыся на перакладных дахаты, з дурной начоўкай у Берліне, я быў так рады, што жывы і здаровы, аж лятаў як на крылах, як толькі пераехаў нашу мяжу ў Берасці.

**Андрэй Дынько**

## Пытанні Лукашэнку перадалі праз БРСМ

Кіраўнік грамадскай кампаніі «Гавары праўду» паэт Уладзімір Някляеў прынёс у Адміністрацыю прэзідэнта паштоўкі кампаніі з пытаннямі да Лукашэнкі, сабранымі ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. Па яго словах, прынёс сам, бо поштай «лісты праўды» не даходзяць да адрасата. Нібыта, іх нават нішчаць на поштах. Найбольш частыя пытанні — высокія стаўкі арэнды на рынках, малыя пенсіі і нездавальняючы ўзровень капітальнага рамонту.

Затое БРСМ «раптам» пачаў маштабную акцыю з падазрона падобнай назвай «Задай пытанне прэзідэнту».

Словы Някляева пра пільны інтарэс да кампаніі з боку сілавых структур праілюстравалі спецназаўцы ў цывільным, якія ачапілі будынак БРСМ, куды было вырашана перадаць частку паштовак з пытаннямі, бо ў Адміністрацыі іх прыняць адмовіліся. У БРСМ паштоўкі прынялі вахцёр, папярэдне паказаўшы ў аб'ектыў фатографа радыё «Свабода» дулю.

**Сямён Печанко**

## Нацыянальнасць — чалдон

У Расіі рыхтуюцца да перапісу насельніцтва. Спецыялісты службы статыстыкі падрыхтавалі спіс магчымых нацыянальнасцяў. Сярод іх як мінімум шэсць — беларускіх.

Гэта яшчэ што: у адпаведнасці з загадам расійскага Міністэрства статыстыкі №74 у спіс расійскіх нацыянальнасцяў уключаныя кацапы, індабразільцы, «савецкія», а нават халдзеі і фараоны. Цікава, што, паводле расійскіх дзяржстатыстаў, «жыхары свету» і «грамадзяне Сусвету» — асобныя групы, як і «маларосы» з «хахламі».

Уключэнне гэтых экзатычных нацыянальнасцяў у спіс — улік досведу мінулых перапісаў, падчас якіх жыхары РФ займаліся інтэнсіўнай самаідэнтыфікацыяй.

Нашы крэўныя тут не выключэнне. У паперах расійскіх статыстаў у асобныя групы выдзеленыя «беларусы» і «белорусы», ёсць такія нацыянальнасці, як «берасцейцы» і «пінчукі». Нават расійскія палякі падзеленыя па прынцыпе беларускамоўнасці на «палякаў (з любой мовай, акрамя беларускай)» і «палякаў (з беларускай мовай)».

Статус асобнай нацыі атрымалі нават беларускамоўныя чалдоны. Чалдонамі ў XIX ст. называлі ў Сібіры перасяленцаў з еўрапейскай часткі Расійскай імперыі, у тым ліку з Беларусі. Слова гэта мангольскае і значыць «бадзяга». Цікава, што дзе-ндзе ў Беларусі «чалдонамі» называюць прыезджых з Расіі.

Цікава таксама, што нацыянальнасць «х...й» зафіксаваная ў расійскім спісе нацыянальнасцяў, — гэта не выяўленне стыхійнага пратэсту, выкліканага прыходам перапісчыкаў. Так называюць сябе кітайцы, што спавядаюць іслам.

**Лявон К**

## Літва адмовілася Беларусь называць Belarus

Дзяржаўная камісія па літоўскай мове, разгледзеўшы зварот МЗС Беларусі, прыняла рашэнне пакінуць ранейшы варыянт — Baltarusija. «Літоўскі інстытут гісторыі накіраваў нам свой ліст, у якім гаворыцца, што назва Baltarusija — гэта спадчына савецкіх часоў, але яна ўжо стала традыцыйнай. Іншы ліст прыйшоў з Віленскага ўніверсітэта, у ім казалася, што немэтазгодна мяняць назву суседняй краіны і раяць працягваць называць яе Baltarusijos Respublika — скарочана Baltarusija», — сказала старшыня камісіі Ірэна Сметонене.

Застаецца і традыцыйная, даўняя назва Gudija. Даўнія літоўцы асацыявалі беларусаў з готамі, таму такая і назва.

**ЗП**

# Думалі — маньяк, аказалася — сябар



Ахвяры магілёўскага забойцы.

**У нялюдскім забойстве дзвюх жыхарак Магілёва падазраюць 40-гадовага беспрацоўнага мясцовага жыхара.**

Міліцыя і пракуратура Магілёўскай вобласці раскрылі жорсткае забойства дзвюх жанчын 35 і 40 гадоў, чые расчлянёныя трупы былі знойдзены 23 і 31 сакавіка ў Магілёве. Па падазрэнні ў забойстве затрыманы 40-гадовы беспрацоўны мясцовы жыхар.

Ён, як і забітыя кабеты, вёў асацыяльны лад жыцця. Паводле інфармацыі Генпракуратуры, перад забойствам кат і ахвяры разам пілі ў яго кватэры. Там мужчына, як ён сам прызнаўся следчым пракуратуры, пазабіваў і паразразаў на кавалкі сяброўак. Пасля вынес целы да Дняпра і там пакінуў. Іншых падрабязнасцяў здарэння міліцыя не выдае.

Калі ў Магілёве знайшлі целы, у якіх засталося мала чалавечага, па ўсёй краіне папаўзлі чуткі пра з'яўленне новага серыйнага забойцы-маньяка.

Праваахоўнікі адзначалі, што трупы былі выпатрашаныя і разрэзаныя так, нібы «працаваў» чалавек, які знаецца ў працы паталагаанатама. Людзі казалі, што ў забітых была сяброўка, якая раней працавала ў гарадскім моргу. Забойцу завочна пачалі называць «фацінскім маньякам». Горад накрыла хваля панікі. Жыхары вуліцы Фаціна сустракалі дзяцей са школы нават удзень. Амаль адразу ж з'явілася інфармацыя пра трэцюю ахвяру, хутка абвергнутая міліцыяй. Праваахоўныя органы ад пачатку стаялі на версіі «побытавага» забойства, якая, як бачым, нібыта пацвердзілася. Цяпер у Магілёве паспакайнела.

Апошняе падобнае па жорсткасці злачынства на Магілёўшчыне здарылася пры канцы 1990-х гадоў. Тады невядомы рабаўнік забіў дзвюх прадавачак начных крамаў. Спрабаваў забіць і трэцюю, але жанчына адбілася. Па гарачых слядах забойцу затрымалі.

**Сямён Печанко**

# Невыносны цяжар дабрачыннасці

**На канцэрт «Добры фэст», сродкі ад якога пойдуць дзецям-інвалідам, прададзена ўсяго некалькі дзясяткаў квіткоў.**

На Захадзе дабрачыннасць — норма жыцця. Чаму ў Беларусі людзі так неахвотна адгукаюцца на заклікі дапамагчы абяздоленым?

Недахопу ў рэкламе «Добрага фэсту» няма — яна ідзе і ў метро, і на «Аўтарадыё», і ў інтэрнэце, і на сайце «НН». У абвестках падкрэсліваецца, што, набываючы білет, наведнік не толькі атрымае асалоду ад якаснай музыкі, але і дапаможа дзецям-інвалідам з Чэрвеньскага дома-інтэрната. Апроч таго, кожны глядач зможа зрабіць дарункі: прынесці цацкі, фарбы, альбомы для малявання ды іншыя патрэбныя дзецям рэчы.

Дый канцэрт сам сабою варты — удзел бяруць гурты першага эшалона: IQ48, Neuro Dubel, «Палац».

«Па-першае, людзям на сябе грошай не стае, — лічыць тэле- і радыёвядучая Тамара Лісіцкая, вядомая дабрачыннымі акцыямі ў інтэрнэце. — Па-другое, у нас складаны механізм пералічэння грошай. У дабрачыннасці шмат значыць парыванне — сёння чалавек прачытаў інфармацыю пра хворае дзіця, запаліўся жаданнем, а заўтра ўжо забыў, не дайшоў да банка. А калі б была ў кожнага магчымасць, напрыклад, пералічваць грошы з дапамогай мабільніка, карыстацца веб-кашальком, было б інакш».

Спадарыня Лісіцкая лічыць, што сітуацыя з «Добрым фэстам» вынікае і з агульнага становішча з музычнай культурай у краіне: «Малы медыйны рынак, у якім мала запатрабаваныя нешматлікія якасныя гурты, няма ратацыі слухачоў, прыхільнікаў... І агульнае пагардлівае стаўленне «да свайго», — кажа яна.

Арганізатары фэсту мяркуюць, што адыграў ролю непамысны збег абставінаў: вялікія выходныя і трагедыя ў Польшчы, якая моцна ўскалыхнула людзей. Яны спадзяюцца, што актыўнае набыццё квіткоў пачнецца, як звычайна, у апошнія перад канцэртам дні.

**ПК**



**Добры фэст**

**22 красавіка, клуб «Рэактар» (Харужай, 29).** Удзельнікі: гурты **IQ48** (на фота), **Neuro Dubel**, **B:N**, **«Змяя»** і **Алег Хаменка** (гурт «Палац»). **Пачатак а 19.00.** Квіткі: 20 000 (танцпол загаддзя), 30 000 (танцпол у дзень канцэрта), 40 000 (столік).

Юлія Дарашкевіч

## СЦІСЛА

### Прымусіў раздзецца і пусціў

22-гадовы лідчук падышоў на вуліцы да пяцікласніцы, узяў яе за шыю і прымусіў ісці з ім уздоўж чыгункі. Пад мостам, пагражаючы нажом, запатрабаваў, каб яна раздзелася. Але болей ніякай шкоды дзяўчынцы не зрабіў — праз пару хвілін дазволіў адзецца і пусціў дадому, забараніўшы расказваць бацькам. Раней яго ўжо судзілі за рабаўніцтва. Новае злачынства міліцыя класіфікавала як хуліганства.

### У мінскай саўне сямнаццаць гадоў працаваў бардэль

Паводле аператыўнікаў, бардэль у саўне УП «Вактоп» дзейнічаў і карыстаўся ўстойлівым попытам ад 2003 года. У апошнія гады там завіхаліся 15 «лазеншчыц» на ўсе мужчынскія (а мо і жаночыя) густы. Працоўны калектыў прымаў ад 3 да 10 кліентаў за дзень. Саўна трапіла ў поле зроку міліцыі пасля таго, як яе адміністратар пачаў наладжваць канал для перапраўкі беларускіх дзяўчат у замежныя бардэлі.

### «Хуткая» наехала на бабулю

Кіроўца машыны хуткай дапамогі здаваў назад у мінскім двары і наехаў на 83-гадовую жанчыну. Той самай машынай яе завезлі ў бальніцу, дзе выявілі лёгкую чэрапна-мазгавую траўму, закрытыя пераломы пляча і лакцявога адростка. Траўмы невялікія, але ў сталым веку косткі горай зрастаюцца. Такія выпадкі падчас руху аўто заднім ходам — частыя ў вузкіх гарадскіх дварах. Кіроўцам трэба быць надзвычай уважлівымі.

### Напаў з нажом на касірку абменніка «БПС-Банка»

У Мінску здзейснены разбойны напад на пункт абмену валют «БПС-Банка» ў гандлёвым цэнтры «Вестэр» на вуліцы Уманскай. Рабаўнік з нажом падпільнаваў касірку, калі яна адамкнулася, каб выйсці на перапынак. На крык жанчыны прыбеглі ахоўнікі крамы і міліцыянт, якія затрымалі злачынцу. Гэта 29-гадовы беспрацоўны жыхар Рэчыцы.

### Двое забіліся на дэльтаплане

У Пружанскім раёне разбіўся дэльтаплан «Авіяхімсэрвісу». Адзін з пілотаў 1964 г.н. загінуў адразу, другі 1959 г.н. пасля памёр у бальніцы. Аварыя адбылася ля вёскі Вялікія Якавічы (3 км ад Пружан). Цяпер пракуратура выясняе, чаму лятальны апарат абрынуўся са стометровай вышыні.

### Кавалкі «Мерса» разляцеліся на 60 метраў

Вучань 10 класа магілёўскай школы вырашыў пакатаць сяброў на бацькавым «Мерсэдэсе». Гора-кіроўца не даў рады цяжкому аўто, вылецеў на ўзбочыну і даўся ў слуп. Удар быў такой сілы, што кавалкі машыны разляцеліся на 60 метраў. Загінула 17-гадовая пасажырка, трое хлапцоў шпіталізаваныя. З-за хлапечай дурноты гора і ім, і бацькам на ўсё жыццё.

### Снарад ля дзіцячага садка

Гэткі сюрпрыз — 82-міліметровую мінамётную міну ваенных часоў — выявілі ў вёсцы Хальч Веткаўскага раёна. Ратавальнікі эвакуявалі 22 дзяцей і 20 супрацоўнікаў садка. Сапёры абясшкодзілі знаходку.

### Забілі двух старых на хутары

Жудаснае забойства адбылося на хутары між вёскамі Сурынка і Забулле Слонімскага раёна. Там жылі дзве пенсіянеркі Ніна і Яўгенія Навумчык. Нядаўна іх знайшлі зарэзаных. Падобна, што нелюдзі трапілі ў хату праз акно. У хаце вэрхал — нібыта шукалі грошай. Па словах суседзяў, сёстры трымалі добрую гаспадарку: карову, авечак, курэй. Рабаўнікі да іх прыходзілі неаднойчы, але жанчынам усё неяк удавалася адбіцца. Аднойчы нават выклікалі міліцыю. Сёстраў знайшоў раніцай малаказборшчык. У забойстве падазраюцца раней судзімы 41-гадовы жыхар Слоніма і 20-гадовы жыхар вёскі Бабынічы. Гэты ўжо затрыманы.

## СУМНЫ КУР'ЁЗ

### Любіце ўсё жывое, ды меру знайце

Гродзенцы закармілі да смерці ламу ў заапарку.

За чатыры святочныя дні паглядзець на жывёлаў у гродзенскі заапарк прыйшло больш за пяць тысяч чалавек. Многія традыцыйна прыйшлі з хлебам і булкамі. Просьбы супрацоўнікаў заапарка не карміць жывёлін такія наведнікі звычайна ігнаруюць і нават успрымаюць агрэсіўна — людзі лічаць, што за 2 000 рублёў, аддадзеных на ўваходзе, яны маюць права праводзіць свой час у заапарку як захочуць, маўляў, «падумаеш, маленькі кавалачак хлеба».

Пяць тысяч маленькіх кавалачкаў давялі да смерці маладога самца ламы. На жаль, людзі не разумеюць, што насычэнне у жвачных надыходзіць не адразу. Хлеб не паспявае ператраўлівацца, ён назапашваецца ў іх передстраўніку і пачынае брадзіць. Газы раздзімаюць страўнік як барабан, ён сціскае пячонку, ныркі, сэрца і лёгкія. Жывёла адчувае моцны боль і памірае ад удушша. Дапамагчы ў такой сітуацыі дзікай жывёліне практычна немагчыма.

Менавіта такое, «дзякуючы» наведнікам, адбылося з ламай па мянушцы Кузя.

**Паводле Блог Гродна s13**



# Янкі точаць зубы на наш уран

**Сіндром абложанай крэпасці — так можна сцісла адкаментаваць сутнасць выказванняў Лукашэнкі на Гомельшчыне. Піша Аляксандр Класкоўскі.**

Крытычная маса інфармацыйных нагод змусіла яго падчас тура па аграрнай глыбінцы да каскада красамоўных заяў.

Пасланне першае: злая Масква. Трэба, маўляў, яшчэ паспрабаваць па-мужчынску пагаварыць з Мядзведзевым, але калі будуць раз-пораз даваць выспятка — працягнем пошукі шчасця «ў іншых пунктах планеты».

Пасланне другое: злая Амерыка, каварны Захад. Яны патрабуюць аддаць узбагачаны ўран (для электарату, дарэчы, вялікі сюрпрыз, што ў нас яго сотні кілаграмаў) і праз тыя спрэчкі не запрасілі на саміт па ядзерным раззбраенні.

А нашы нацыяналісты, маўляў, і так здуравалі, аддаўшы некалі ядзерныя ракеты («величайшее достояние»!) ні за нюх табакі. Тое, што цяпер не запрасілі ў Вашынгтон на саміт, — «бязмозгласць і тупая інерцыя». Увогуле ж «ні амерыканцам, ні ў цэлым Захаду давяраць нельга».

Такім чынам, залпы па ўсіх азімутах.

Асабліва варта адзначыць, што Расія і ЗША трапілі на арэхі ў адным пасажы за тое, што паспяшаліся падтрымаць «антыканстытуцыйны пераварот» у Кыргызстане. «Яны мусілі заявіць пра непрымальнасць такіх дзеянняў кіргізскай апазіцыі», — зазначыў Лукашэнка.




Увогуле спачуванне зрынутаму калегу проста кранальнае: «Ён, небарака, гойсаў па розных краінах, выпрошваючы крэдыты».

І яшчэ адно красамоўнае выказванне: няма чаго папракаць Бакіева, што ўлада «ўжывала сілу, абараняючы сябе»! Яшчэ болей: калі б нехта паспрабаваў зладзіць падобныя забурэнні ў Беларусі, то «мала б нікому не здалося».

Абвостраная рэакцыя Лукашэнкі на розныя каляровыя рэвалюцыі даўно вядомая. У гэтым жа выпадку, відавочна, найболей уразіла тое, што Масква адразу ж заняла бок «дэструктыўных элементаў» і здала Бакіева, не зважаючы на фармальную «ўсенароднаабранасць».

Эксперты зазначаюць, што гэта новая палітыка Крамля. Раней там дэкларавалі, што нідзе на постсавецкім абсягу з апазіцыяй не гуляюць. Але ў выпадку з Бакіевым Масква без ваганняў адраклася ад слізкага партнёра, які казаў пра «шматвектарную дыпламатыю», а насамрэч хацеў атрымліваць і расійскія крэдыты, і амерыканскія долары за базу «Манас». І гэта трывожны званочак для нязменнага беларускага прэзідэнта.

Сімптаматычна ў гэтым кантэксце выглядае тое, што ён ужо другі раз за апошні час падкрэсліў: апазіцыйныя журналісты, якіх нядаўна трэслі, «працавалі на Маскву».

Увогуле ж нагнятанне сіндрому аточанай крэпасці можна трактаваць як перадвыбарны піяр. Эканамічныя праблемы абвастраюцца, заробак 500 долараў віламі па вадзе пісаны, і выпрабаваны метад — вярнуць горы на ворагаў, што точаць зубы на сінявокую рэспубліку. Не саступім ні пядзі! Ні грама ўрану!

# Чарнобыльскі цукар

**Памятаю: на кухні ў нашай мінскай кватэры бацька слухае рыпучы прымач. Маці нечым усхваляваная, збянтэжаная. У чым справа? Нам з сястрой даюць пігулкі — антыструмін. Піша Алесь Кудрыцкі.**

Для майго пакалення, народжанага ў 1980-я, Беларусь без радыяцыі засталася хіба што ў дзіцячых успамінах, такіх далёкіх, што ўжо і не ведаеш, што было сапраўды, а што мы прыдумалі. Свядомая, дарослая памяць пра ўласныя спробы разабрацца ў тым, што адбываецца, пачынаецца ў мяне менавіта з Чарнобыля.

Памятаю: на кухні ў нашай мінскай кватэры бацька слухае рыпучы прымач. Маці нечым усхваляваная, збянтэжаная. У чым справа? Нам з сястрой даюць пігулкі — антыструмін.

Даведаўшыся з Польскага радыё пра тое, што адбываецца, бацька збегаў у аптэку на суседняй вуліцы ды запытаўся пра тыя лекі. Дзіва: аптэкарка была гатовая прадаваць антыструмін хоць кілаграмамі — усё было завезенае, усё гатовае.

Так яно і праляжала на складах. Тэлебачанне маўчала, савецкія правадыры, наклаўшы ў порткі, адседжваліся на лецішчах. І хоць я дакладна не разумеў, што такое радыяцыя, паводзіны бацькоў казалі мне: з гэтым неадкладна трэба нешта рабіць. А па тэлебачанні, наадварот, усяляк даводзілі, што рабіць нічога не трэба.

Я верыў бацькам і, адпаведна, не мог верыць тэлебачанню. Савецкі чалавек, дарэчы, мусіў бы рабіць акурат наадварот. Думаю, менавіта тады зрабілася зразумела, што ні з мяне, ні з маіх аднагодкаў савецкіх людзей ужо не вырасце.

Дзякуючы Чарнобылю, нам з сястрой давялося ўпершыню пакаштаваць віна — бадай, сухога, бо я нават смаку яго не памятаю, толькі светла-рубінавы колер. Казалі, што дапамагае ад радыяцыі. А потым позна ўвечары ў дзверы пазванілі незнаёмыя людзі. Памятаю паўцемру і сцішаныя галасы.

Нараніцу бацькі ўжо не было дома. Пабачылі мы яго праз некалькі дзён на зборным пункце ў Калядзішчах, у вайсковай форме.

На чорна-белым фота з тых часоў — маці без усмешкі, я з зухаватым выглядам у вайсковай пілотцы на галаве ды маленькая сястра са спужанымі вачыма — такімі вялізнымі, што, здаецца, і твару не бачна, адны вочы. Толькі нядаўна яна распавяла, што думала, нібыта бацьку забіраюць на вайну, і ён ніколі не вернецца. Вось жа ўявіла сабе дзіця такое і нават не сказала нікому... Узгадваюцца дужа прыгожыя дрэвы ў квецені і пах вайсковай кухні, кацялок, у якім бацька прыносіў пакаштаваць кашы. Мне, хлапчуку, усё гэта было цікава, але псавала настрой няпэўнасць: што адбываецца, чаму, калі вернецца тата...

А яшчэ мне надта спадабаўся кавалачак цукру, які бацька прынёс да гарбаты. Памятаеце, у цягніках у тыя часы давалі такія маленькія цаглінкі цукру ў папяровых абгортках, на якіх быў намаляваны нейкі футурыстычны цягнік на фіялетавым фоне. Такі самы цукар уваходзіў і ў сухі паёк ліквідатараў. Я паклаў той цукар у кішэню не разгарнуўшы. Дома дастаў яго, узважыў на далоні і выrашыў: схаваю ў шуфлядзе. З'ем, калі тата вернецца. Дачакаюся.

Чаму бацька адчыніў дзверы, калі прынеслі позву? Многія ж неяк схаваліся, з'ехалі з горада. Надоечы я спытаўся ў яго пра гэта. «Ну што я буду хавацца, калі бяда такая, — адказаў ён. — Што зробіш. У мяне ж і бацькі там...»

Там — гэта ў вёсцы Слабажанка, якая ляжыць ля самых Мележавых Глінішчаў. Людзі на балоце. Цяпер — каля самай мяжы зоны адсялення. Найлепшыя мясціны, амаль курортныя, не параўнаць з раскіслым ад бясконцай халоднай вільгаці Мінскам. Моцныя хаты, некалькі з іх збудаваў мой дзед, які ўсё жыццё і з дрэвам працаваў, і печы клаў, і пчолаў разводзіў. Так бацька на нейкі час вярнуўся ў свае мясціны, якія раптоўна ператварыліся ў 30-кіламетровую зону. На фотках — страшэнна прыгожыя краявіды, салдаты ў рэспіратарах мыюць з брандспойтаў грузавікі, над вёскамі вісяць агромністыя пачварныя верталёты, якія засыпаюць хаты даламітам.

Чарнобыль нахабна прысабечыў бацькоўскую вёску, дзе можна было б бавіць дзяцінства.

Дадалося і схаванае пачуццё сораму, якое адчувалася ў кожны з рэдкіх прыездаў да дзядоў. Бабуля накладае табе талерку ўсяго найлепшага, вырашчанага на зямлі, а ў цябе, начытанага гарадскога хлопца, у страўніку варушыцца здрадніцкі халадок: ці гэта бяспечна есці?

У хаце стаяць магутныя лавы, зэдлікі, куфры, якія дзед рабіў уласнымі рукамі. На сцяне старажытная сямейная ікона. На шчасце, нават у мяне хапае глуздоў не прыкладаць да твару Хрыста дазіметр. Каб жыць, бывае важней верыць, чым ведаць.

Радыяцыя — гэта яшчэ і пытанне веры. Напэўна, гэта разумее толькі той, хто нарадзіўся ў гэтай краіне.

* * *

Лета скончылася. Бацька вярнуўся, і кавалачак цукру я ўрачыста рассмактаў на языку. Лепшага цукру я не каштаваў ніколі ў жыцці.

# Батура на амбразуры

Старшыня савета рэспублікі нацыянальнага сходу Беларусі (нешта накшталт сената) Барыс Батура ўзяў удзел у пахаванні прэзідэнта Леха Качынскага.

**Пахаванне — не вяселле. На пахаванне не запрашаюць.**

Ёсць у мяне смутная здагадка, што ў Польшчу паляцеў бы і самы галоўны ў Беларусі. Калі б яго запрасіў маршалак Сойма, в. а. прэзідэнта Браніслаў Камароўскі. Але ж пахаванне — не вяселле.




**Такі сумны жарт прыдумалі расійскія інтэрнаўты.**

На пахаванне не запрашаюць.

Сваёй паездкай у Варшаву і Кракаў Лукашэнка мог бы даць сігнал для перазагрузкі беларуска-польскіх адносінаў. Не даў.

**Анатоль Сідарэвіч**

## Чэшскі прэзідэнт пра еўракіраўніцтва: Гэта недаравальна

Прэзідэнт Чэхіі Вацлаў Клаус, які прыехаў у Кракаў на пахаванне прэзідэнта Леха Качынскага і яго жонкі, выказаў здзіўленне з нагоды адсутнасці кіраўніцтва ЕС.

— Я яшчэ зразумеў бы адсутнасць прэм'ер-міністра Канады і генерал-губернатара Аўстраліі... але тое, што ніхто не прыехаў з Брусэля, — гэта, на маю думку, недаравальна, — паведаміў Клаус «Чэшскаму радыё».

Сярод тых, хто адсутнічаў на пахаванні, — старшыня Еўрапейскай камісіі Жазэ Мануэль Барозу і старшыня Еўрапейскай рады Херман ван Рампей.

На пахаванне ў Кракаў прыехаў старшыня Еўрапарламента Ежы Бузэк.

Затое прэзідэнты Грузіі, Расіі і Украіны на пахаванне прарваліся, не зважаючы на хмары




попелу. «Сапраўдны сябар заўжды знойдзе спосаб дабрацца і падтрымаць, нават калі тое немагчыма», — такі постэр з партрэтам Міхаіла Саакашвілі стварылі ўдзячныя польскія інтэрнаўты на сайце demotywatory.pl (на фота). Грузінскі прэзідэнт перадрукаваў яго на сваёй старонцы ў Фэйсбуку.

**СГ**

## БЕЗ КАМЕНТАРОЎ

### Чаргінец: Што ж ваш прэзідэнт нарабіў?!

Кіраўнік лукашэнкаўскага Саюза пісьменнікаў Мікалай Чаргінец зазначыў, што ў яго рамане «Тайны Авальнага кабінета» ўсё да драбніц адпавядае гістарычнай праўдзе: «Амерыканцы ўпрошваюць мяне чацвёрты год перавыдаць. Гаворка ідзе пра тое, што рабіў прэзідэнт Амерыкі. Вы не знойдзеце там ніводнага факта прыдуманага, калі гаворка ідзе аб «салёнасці». Вы папракаеце: «Ай-ай, што ж там напісаў!?» А я магу сказаць: «Ай-ай, што ж ваш прэзідэнт нарабіў?!» Я пісаў праўду», — адзначыў М.Чаргінец.

**Кастусь Матушыч**

# Баі мясцовага значэння

Працяг са старонкі 1.

### У бой ідуць адны медсёстры

Цікавую тактыку прымянілі аршанскія гарадскія ўлады. Мясцовая кааліцыя АДС заклікала сваіх кандыдатаў не вылучацца ў дэпутаты. Чакалася, што выбары могуць быць цалкам безальтэрнатыўнымі. Не ўдалося. У супернікі асноўным праўладным кандыдатам былі вылучаныя... медсёстры.

Так, у Інструментальнай акрузе № 21 балатуецца дырэктар завода «Чырвоны барацьбіт» Аляксандр Шульгін і медсястра УАЗ «Аршанская цэнтральная паліклініка» Валянціна Салянікава.

У Партызанскай акрузе № 22 з намеснікам дырэктара механіка-эканамічнага каледжа Таццянай Захаравай за мандат будзе змагацца медсястра Святлана Фядорчанка.

У Заслонаўскай акрузе №24 «спаборнічаюць» дырэктарка чыгуначнага тэхнікума Алена Казлова і зноў медсястра Іна Касухіна.

Такім чынам, пратэстна настроеныя выбарцы атрымліваюць псеўдаальтэрнатыву кандыдатам ад уладаў.

### Псеўдаальтэрнатыўнасць у Горках і Жодзіне

Актывіст з Горак Ілля Заранок кажа, што нешта падобнае назіраецца ў Дрыбінскім і Мсціслаўскім раёнах, дзе вылучэнцаў ад апазіцыі няма зусім. «Па акрузе вылучаюцца, скажам, два пенсіянеры, два дырэктары, два бээрэсэмаўцы», — кажа І.Заранок.

У саміх Горках балатуюцца тры актывісты: Галіна Будная (БНФ), Эдуард Брокараў (БНФ), Жанна Шчарбініна (БХД).

Абсалютна ва ўсіх 34-х акругах будзе канкурэнцыя ў Жодзіне. Але там так лёгка і не вызначыш, хто ж з'яўляецца кандыдатам ад улады. Спаборнічаць будуць намеснік дырэктара Жодзінскай ЦЭЦ і начальнік службы эксплуатацыі раённага ўпраўлення «Смалявічырайгаз», дырэктар сацыяльна-педагагічнага цэнтра і дырэктар завода, начальнік міліцыі і дырэктар прадпрыемства ЖКГ.

Нешматлікім апазіцыянерам таксама паставілі па два супернікі — сябра АГП Аляксандр Валчанін балатуецца ў адной акрузе з дырэктарам прадпрыемства і начальнікам цэха, а лідэр руху ветэранаў Афганістана Аляксандр Камароўскі — з начальнікам тэхбюро БелАЗа і дырэктарам гімназіі.

У суседнім Барысаве з 34 акруг толькі ў трох будзе альтэрнатыва.

### Аматара Сталіна не зарэгістравалі

У Мазыры быў зарэгістраваны палітзэкрут Франак Вячорка. Сваю кампанію хлопец пачынаў яшчэ, калі быў звычайным радавым. У наступны дзень пасля камісавання Франак зноў накіраваўся ў Мазыр, каб весці агітацыю. Суапернікам Вячоркі па акрузе будзе дырэктар спартыўна-гарналыжнага комплексу Каробкін.

У Мазыры таксама яшчэ зарэгістраваны Сяргей Лапуста з АГП, які будзе змагацца з бізнесменам Чабанянам (яму належыць сетка аптэк).




Цікавы выпадак адбыўся ў Свіслачы (Гродзенская вобласць), дзе не зарэгістравалі былога старшыню райвыканкама Анатоля Кузьму. Гэты чалавек быў вядомы тым, што ініцыяваў усталяванне ў мястэчку адзінага ў краіне помніка Іосіфу Сталіну.

### Феномен Валабуева

У Салігорску актыўна праходзіць выбарчая кампанія Аляксея Валабуева. «Маладафронтавец» узяў і выклікаў на дэбаты свайго суперніка — вайсковага камісара Валера Заінчкоўскага. А ён вазьмі ды пагадзіся. Дэбаты прайшлі 20 красавіка ў Доме будаўнікоў.

### І адна Карач

У Віцебску ва ўсіх 40 акругах ёсць вылучэнцы ад улады. Палова з іх — гэта дырэктары прадпрыемстваў і іх намеснікі, а таксама пяць галоўных дактароў мясцовых бальніц і паліклінік. Акрамя таго, у кандыдатах у дэпутаты ёсць прарэктар ВНУ, камандзір вайсковай часці і вайсковы камісар, начальнік пажарнага аварыйна-выратавальнага атрада «Віцязь». Ад апазіцыі ў Віцебску ідзе Вольга Карач з АГП.

У Наваполацку ўсе 65 кандыдатаў (на 34 месцы) беспартыйныя. Тут кандыдатам-начальнікам таксама паставілі ў супернікі настаўнікаў, выхавацелек дзіцячых садкоў і прадаўшчыц.

Абсалютна безальтэрнатыўныя раёны ёсць як у традыцыйна нацыяналістычных рэгіёнах на Захадзе краіны (Астравец, Столін), так і ў гомельскім апірышчы лукашэнкаўцаў (Акцябрскі, Чачэрск).

У Баранавічах з дзесяці апазіцыянераў зарэгістраваны толькі адзін.

На мінулых мясцовых выбарах яўка грамадзян склала крыху больш за 70%. Цяжка паверыць, што сёлета, без прыцягнення адміністратыўнага рэсурсу, яна можа быць большай.

**Зміцер Панкавец**

# Востраў імітацыйнай дэмакратыі

**З 57 мінскіх выбарчых акругаў няма ніводнай безальтэрнатыўнай.**

У сталіцы створаная бачнасць барацьбы. Апазіцыя ў Мінску выставіла, у асноўным, моладзь.

Адна з найбольш цікавых акруг у Мінску — Машэраўская №47. Напэўна, такога ў нас яшчэ не было, каб у адным выбарчым бюлетэні былі адначасова прозвішчы мужа і жонкі. А вось у гэтай акрузе менавіта так. У гарсавет балатуюцца **Аляксандр і Таццяна Куўшынава**.

Кампанія ў апошняй была досыць актыўная. Цэнтр Мінска быў завешаны плакацікамі «Наша Таня :)». Куўшынава ідзе на выбары з лозунгам «Хараство выратуе Мінск». Дзяўчына досыць актыўная ў сацыяльных сетках, мае ўласны сайт. Кампанія праходзіць цалкам на расійскай мове. Напэўна, менавіта Куўшынава і ёсць адной з найбольш яркіх кандыдатак на гэтых выбарах.

Таксама ў Машэраўскай акрузе ідзе сябар лукашэнкаўскай Кампартыі **Юры Васкрасенскі**. У свой час ён вылучаўся на парламенцкіх выбарах па адной акрузе з лідэрам былога ПКБ **Сяргеем Калякіным**. Перамагчы абодва кандыдаты не змаглі, але вось галасоў Васкрасенскі ў сустаршыні АДС адцягнуў.

**Кірыла Баравік** прадстаўляе ліберальна-дэмакратычную партыю. На ўлётках кожнага ліберал-дэмакрата зверху змешчаны партрэт іхняга правадыра **Сяргея Гайдукевіча** з подпісам, што гэта будучы кандыдат у прэзідэнты. Дарэчы, большасць кандыдатаў ад ЛДПБ маюць сталую працу — сталяр, кантралёр завода, індывідуальны прадпрымальнік і нават стралок аховы Беларускай чыгункі. А вось апазіцыянеры часта ідуць на выбары як вымушана беспрацоўныя.

Лідэру Партыі БНФ **Аляксею Янукевічу** ў Галадзедаўскай акрузе процістаіць начальнік аўтапарка №6 **Аляксандр Цішкевіч**. Трэцяй будзе 19-гадовая **Вольга Бягун** з ЛДПБ.

У былога палітвязня **Артура Фінькевіча** таксама два супернікі — дырэктар гандлёвага камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Універмаг «Беларусь» **Мікалай Мятліцкі** і вадзіцель **Дзмітры Мальчэўскі** (зноў ЛДПБ).

А вось у старшыні незарэгістраванай Партыі свабоды і прагрэсу **Уладзіміра Навасяда** супернікаў у Пляханаўскай акрузе больш. Тут і 19-гадовы студэнт Маскоўскага ўніверсітэта эканомікі **Аляксей Рашэтнік**, галоўны доктар цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Ленінскага раёна **Віктар Жукоўскі**, інжынер-электронік політэхнічнай гімназіі №6 **Мікалай Дылько**, прадавец прадпрыемства «Прадукты і напоі» **Вераніка Раманчык**.

Вядомы змагар з п'янствам, бацька пяці дзяцей, сябар Хрысціянскай дэмакратыі **Леанід Скарабагаты** балатуецца ў Кастрычніцкай акрузе. Разам з ім у бюлетэнях значацца член БРСМ **Уладзімір Цюхай** (пра яго мы пісалі ў №14), старшыня прафкама Завода паўправадніковых прыбораў навукова-вытворчага аб'яднання «Інтэграл» **Галіна Марціновіч**.

Бізнесмен **Юрый Данькоў**, які спрабаваў вылучыцца на прэзідэнцкія выбары ў 2001 годзе, спрабуе прабіцца ў гарсавет у Купрыянаўскай акрузе. Тут ён змагаецца з намеснікам начальніка «Мінскага метрапалітэна» **Анатолем Сарокіным**.

**Юрасю Меляшкевічу** з Руху «За Свабоду» давядзецца, як і Аляксею Янукевічу, супернічаць з дырэктарам аўтапарка. **Міхаіл Марцуль** узначальвае аўтобусны парк №5.

Ажно восем прозвішчаў будзе ў бюлетэнях жыхароў Сухараўскай акругі. Там балатуецца палітолаг, сябра Руху «За Свабоду» **Алесь Лагвінец**. Выглядае на тое, што кандыдатам ад улады па акрузе ідзе дырэктарка сярэдняй школы №158 **Марына Мушніцкая**.

Таксама на гэтай акрузе будзе адразу тры кандыдаты маладзейшыя за 30 гадоў: вядучы інжынер прадпрыемства «ПромМВТ» **Арцём Арлоў**, галоўны бухгалтар замежнага ТАА «Хлебадар» **Ганна Гаршкова** і дырэктар Асацыяцыі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва **Арцём Шаркоў**. На трох маладых адзін пенсіянер — 76-гадовы **Віктар Кавалькоў** з апазіцыйнага «Справядлівага свету».

Зноў у дэпутаты спрабуе трапіць былы сацыял-дэмакрат **Уладзімір Нісцюк**, які першы загаварыў пра дыялог апазіцыі з уладай. У Нісцюка супернікамі будуць як дырэктарка школы №125 **Таццяна Берасцевіч**, так і юная сяброўка АГП **Ганна Ягорава**.

Кіраўнік мінскай гарадской арганізацыі Партыі БНФ **Віктар Івашкевіч** балатуецца ў Старавіленскай акрузе. Галоўным ягоным канкурэнтам выступае памочнік дэпутата палаты прадстаўнікоў **Георгій Атаманаў**, сябра КПБ.

Ідуць на выбары не толькі прафесійныя палітыкі. Зарэгістраваўся ў Нававіленскай акрузе намеснік дырэктара выдавецтва «Галіяфы» **Міхась Башура**. Ад улады па гэтай акрузе ідзе старшыня рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў дзяржаўных установ **Сяргей Халява**. А ад апазіцыі — **Віталь Стажараў** з АГП.

У Міраўнічэнкаўскай акрузе балатуецца **Вінцук Вячорка** з Партыі БНФ. Разам з ім ідуць яшчэ два партыйцы — **Уладзімір Галабурда** (Партыя працы і справядлівасці) і **Эдуард Кузняцоў** (ЛДПБ).

Намеснік Калякіна па «Справядлівым свеце» **Валеры Ухналёў** зарэгістраваны ў Акадэмічнай выбарчай акрузе, былы палітвязень **Зміцер Каспяровіч** — у Куйбышаўскай.

Ну а выбарцы Трактаразаводскай акругі змогуць прагаласаваць за сапраўднага графа. Па спісах БХД тут ідзе **Аляксандр Прушынскі**.

**ЗП**

# Зміцер Бабіцкі: Кандыдат у дэпутаты — як баксёрская груша

Эфект удзелу апазіцыі ў палітычных кампаніях неадназначны, прызнае 30-гадовы ветэран выбараў у Барысаве.

Рашэнне пайсці ў кандыдаты было не з лёгкіх для Змітра Бабіцкага. Сам ён параўноўвае яго з рашэннем стаць «баксёрскай грушай». Аднак заўважна, што малады чалавек мае моцную падтрымку не толькі ад сваякоў, але яшчэ і ад настаўнікаў гімназіі, суседзяў ды іншых жыхароў мікрараёна ў сваім родным Барысаве.

Калі ў нядзелю 18 сакавіка журналісты «НН» прайшліся па кватэрах разам са Змітром, былі ўражаны. Зразумела, што дзверы адмыкаюць далёка не ўсе, аднак тыя, хто адмыкае, пазнаюць свайго кандыдата і зычаць поспехаў і перамогі. Самі за сябе гавораць лічбы: з акругі, у якой зарэгістравана 4,5 тысячы выбарцаў, у сваю падтрымку Зміцер Бабіцкі сабраў 788 подпісаў.

Пра мінулыя выбары ў мясцовыя саветы дэпутатаў Зміцер узгадвае як пра цырк. Па пратаколах, якія старшыні камісіяў паказалі ў дзень выбараў у нядзелю назіральнікам, Зміцер перамагаў з перавагай у 37 галасоў. Аднак потым камісія знікла, з'явілася толькі ў аўторак. Паводле новых вынікаў, Бабіцкі прайграў 22 галасы.

**«НН»: Дык і гэтым разам будзе нешта падобнае! Хіба не так?**

**ЗБ:** Адназначна будзе. Па паводзінах раённай выбарчай камісіі бачна, што яны зробяць усё, каб я не атрымаў мандата. Крайні недавер гэтай камісіі! Яна складаецца з людзей, якія кепска сябе зарэкамендавалі. З некаторымі з іх мы судзіліся яшчэ ў 2003 годзе, калі мяне ўвогуле не зарэгістравалі як кандыдата. Тады мы судзіліся і ў райсудзе, і ў абласным. Я гэтых ведаю як аблупленых, і іх зноў прызначаюць кантраляваць выбары.

Я неяк сустрэў сваю прыхільніцу, якая таксама была членам камісіі на адных з выбараў. Яна расказала, што кожнаму кандыдату яны прыпісалі роўную колькасці галасоў, каб перавыбараў не было. Каб «народныя грошы не марнаваць». Я запытаў, ці ведае яна, што гэта цяжкае крымінальнае злачынства, якое не мае тэрміну даўніны, — фальсіфікацыя выбараў. Яна была шакаваная, бо яны ж хацелі як лепей, па справядлівасці кожнаму прыпісалі...

Вось так у нас праводзяць выбары, а маіх прадстаўнікоў не ўключаюць, не даюць назіраць за выбарамі нармальна, пералічваць бюлетэні.

**«НН»: Хто вашы апаненты сёлета?**

**ЗБ:** О, улада вырашыла пагуляцца ў палітыку. Тады проста білі ломам, а цяпер будуць біць ломам хітра. Большасць акруг у горадзе безальтэрнатыўная, але на маю акругу ўлада выстаўляе ажно двух дырэктараў. Што ж гэта за акруга такая ўнікальная №15, што тут ажно 3 кандыдаты?

Чалавек, у якога няма маёмасці, ніколі не зробіць палітычны выбар.

**«НН»: Унікальная?**

**ЗБ:** Аж да смешнага! Мой былы апанент, камандзір мясцовага аўтапарка, меў прозвішча Шкрэдаў, пачынаецца на літару Ш. І вось цяпер выстаўляюць супраць мяне яшчэ двух дырэктараў, прозвішчы якіх таксама пачынаюцца на літару Ш. Мо яны ў выканкаме акультызм практыкуюць? Супраць Бабіцкага трэба выстаўляць чалавека на Ш.

**«НН»: Напэўна, гэтыя дырэктары маюць падтрымку сярод выбарцаў?**

**ЗБ:** Дырэктарат падтрымкі ў людзей не мае. У акрузе, дзе я балатуюся, у асноўным жывуць людзі, якія перасяліліся з вёскі. Яны ніколі надта не любілі савецкую ўладу, і да сённяшняй крытычна ставяцца.

Плюс, самі разумееце, гэта не Мінск, тут інфраструктура дабітая. Дарогі дваццаць год не рамантаваліся. Дамы пабудавалі, а як вы там, людзі, ходзіце, усім па барабане. У людзей цякуць дахі, па дамах пацукі бегаюць, звалкі не прыбіраюць гадамі.

А ў паліклініках што робіцца?

У той жа час ёсць вялікая частка людзей, так званыя «адабрямс», ёсць... Падняліся з раніцы, паснедалі і пацягнуліся галасаваць за гэтую мумію.

Я ведаю сцэнар улады. Кандыдат №1 набярэ 50% з капейкамі. Кандыдат №2, падстаўны, набярэ 25%. Іншыя 25% падзеляцца супраць усіх і за Бабіцкага. Вось Бабіцкі набярэ каля 15% галасоў. Вось, Бабіцкі, за цябе прагаласавала 250 чалавек, хаця подпісаў сабрана пад тысячу. А людзі будуць казаць: ну, Бабіцкі, не прагаласавалі за цябе, ну што ж ты хочаш.



**Зміцер Бабіцкі**

30 гадоў, барысаўчанін у пятым пакаленні. Скончыў Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт па спецыяльнасці «Дзяржаўнае і муніцыпальнае кіраванне». Фактычна жыве з жонкаю ў Мінску. Але лічыць, што ў сталіцы і так хапае разумных людзей. А калі нешта рабіць, то рабіць для малой радзімы — Барысава.

**«НН»: А калі раптам пераможаце, што будзеце рабіць?**

**ЗБ:** Вярну сістэму звароту грамадзян. Таму што па факце яна ў нас не працуе. Добра, калі абраныя ў 2007 годзе дэпутаты правялі хаця б адну сустрэчу з тымі, хто іх выбіраў.

Выканаўчая ўлада паўсюль парушае правы жыхароў: камунальныя, на працы, што датычаца аховы здароўя. І тут дэпутат можа выканаць функцыю абаронцы. Зрэшты, мы ў сваім горадзе такімі каталізатарамі зменаў былі і без кандыдацкіх мандатаў і будзем надалей. Але з дэпутацкім мандатам гэта рабіць прасцей.

**«НН»: Вы, напэўна, ужо многіх ведаеце ў сваёй акрузе ў твар. А яны? Ці змянілася стаўленне да вас з 2003 года?**

**ЗБ:** Так, вядомасць 100%. Усе ведаюць Бабіцкага. У людзей з'явілася адчуванне палітычнага плюралізму. Людзі паверылі ў тое, што яны камусьці патрэбныя, значыць, яны могуць выстаўляць свае ўмовы. Але: мы за цябе галасуем, а нічога няма. Вядома, не ўсе так думаюць. Аднак гэтая тэндэнцыя заўважная. У пэўнай колькасці маіх выбаршчыкаў ёсць такая расчараванасць у палітычным працэсе. Бо ў іх стварылася ілюзія, што гэты палітычны працэс ёсць.

Таму эфект палітычных кампаній неадназначны. Так, падтрымка ёсць. Так, я перамагаю па ўсіх раскладках, але стоадсоткавай падтрымкі няма і не будзе.

**«НН»: У чым праяўляецца такая расчараванасць?**

**ЗБ:** Людзі ўжо не вераць ніякім выбарам. Усе мае суседзі адкрытым тэкстам кажуць: калі б ты не балатаваўся, мы б туды не хадзілі. На мінулых выбарах напісаная яўка была 52%, дзякуючы таму, што гэта я мабілізую сваіх прыхільнікаў, а ёсць і працаўнікі, якія ідуць галасаваць абы супраць БНФ.

Калі б не было дэмакратычнай ініцыятывы, на выбары больш за 30–40% людзей не прыйшло б у жыцці. На прэзідэнцкія — магчыма, а на мясцовыя ці ў парламент — не.

А калі казаць глабальна, то чалавек, у якога няма маёмасці, ніколі не здолее зрабіць палітычны выбар. На Захадзе ж таксама галасуюць тыя людзі, у якіх ад выніку выбараў нешта залежыць. А ў чалавека, які ў нас тут сядзіць перад тэлевізарам, нічога не зменіцца ад выбараў.

У нас і палітычнай культуры няма, нават у пратэставага электарату. Людзі, якія свядома нас падтрымліваюць, яны ж нас падтрымліваюць не як элемент палітычнага працэсу, у заходнім разуменні гэтага тэрміну. Яны нас падтрымліваюць, бо мы супраць чыноўнікаў. Гэта «дубіна народнай вайны», як Талстой пісаў. Мы для іх змагары з несправядлівасцю. Яны нас падтрымліваюць як байцоў, але не як людзей, якія іх інтарэсы прадстаўляюць, якія для горада будуць палітыку мяняць. Для іх гэта не тое, каб грамадзянская вайна, але нейкае супрацьстаянне ў грамадстве. Адныя — за, другія — супраць, але гэта не палітычны працэс, на жаль.

**Настасся Шамрэй**

# Багатыя ідуць на выбары

Праўладныя кандыдаты дэманструюць звышпрыбыткі. Піша **Сямён Печанко**.

Традыцыйна малацікавая як шараговым выбаршчыкам, так і многім палітыкам выбарчая кампанія ў мясцовыя саветы сёлета выклікала ўсплёск цікавасці. А падагрэлі яе публікацыі ў мясцовых афіцыйных выданнях дэкларацый сукупных гадавых заробкаў зарэгістраваных кандыдатаў.

Выявілася, што розніца паміж заробкамі кандыдатаў сягае сотні разоў. Звышпрыбыткі (па беларускіх мерках) прадэманстравала начальства.

130-мільённы гадавы заробак прарэктара Гомельскага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны Сяргея Ханені выклікаў сапраўдны фурор у выбарцаў. І не дзіва — месячны заробак прарэктара большы за гадавую пенсію ягонага канкурэнта ад апазіцыі 73-гадовага сябра партыі «Справядлівы свет» Анатоля Ільвінчыка.

92 мільёны задэклараваў дырэктар Гомельскага хімзавода Ігар Ляшэнка, 84 мільёны ў гендырэктара лікёра-гарэлачнага завода Галіны Кардасевай, 81 мільён у дырэктара фабрыкі «Спартак» Алесі Самсонавай і г.д.

Ажыятаж вакол заробкаў гомельскіх чыноўнікаў і функцыянераў насцярожыў іх калегаў з Гродна. Нумар «Гродзенскай праўды» са звесткамі пра заробкі кандыдатаў не паступіў у вольны продаж, азнаёміцца з імі можна толькі ў бібліятэках.

Адшукаць звесткі пра заробкі кандыдатаў у дзяржаўных выданнях не так проста: многія раёнкі надрукавалі звесткі пра патэнцыйных народных абраннікаў, але «забылі» пазначыць іх даходы. А многія газеты адмовіліся друкаваць падобную інфармацыю, матывуючы гэта вялікай колькасцю кандыдатаў і, адпаведна, адсутнасцю вольнага месца на палосах.

Нумар «Гродзенскай праўды» са звесткамі пра заробкі кандыдатаў не паступіў у вольны продаж. Азнаёміцца з ім можна толькі ў бібліятэках.

Лідэрам сярод гродзенцаў стаў гендырэктар «Гроднажылбуда» Олеш Ушкевіч — 119 мільёнаў. Гадавы заробак рэктара Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Янкі Купалы выглядае сціпла ў параўнанні заробкам гомельскага прарэктара — «усяго» 79 мільёнаў.

Імаверна, такія заробкі тыповыя для лукашэнкаўскай дробнай наменклатуры.

Варта адзначыць, што згодна арт. 68 Выбарчага кодэкса, размяшчэнне ў СМІ звестак пра зарэгістраваных кандыдатаў, у тым ліку і пра іх сукупны гадавы прыбытак, абавязковае. У выпадку немагчымасці публікацыі гэтай інфармацыі ў газетах, выбарчыя камісіі абавязаныя данесці яе да выбаршчыкаў іншым спосабам. Напрыклад, размяшчэннем гэтых звестак на агітацыйных плакатах.

**Сямён Печанко**

## Топ-5 самых багатых кандыдатаў у дэпутаты мясцовых саветаў

**130 млн. — Сяргей Ханеня**, прарэктар Гомельскага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны

**119 млн. —Олеш Ушкевіч**, гендырэктар «Гроднажылбуда»

**116 млн. — Мікалай Патрончык**, начальнік Круглянскага ПМК-266

**102 млн. — Сяргей Сасноўскі**, генеральны дырэктар РУП «Гомельтранснафта» «Дружба»

**92 млн. — Ігар Ляшэнка**, дырэктар ААТ «Гомельскі хімічны завод»

**Паводле звестак, размешчаных у рэгіянальных СМІ, даступных «НН»**

# Падсвілле: Вораг нумар адзін

*«Ты і за плечы не закінеш,
Што ён нахляпае за раз...»*
**Вядзьмак Лысагорскі**

Раніцай першага красавіка не было жартаў. Жартаў увогуле сёння няма ў нашым мястэчку. Няма ў людзей радасці ад натуральнасці: ад сонечнага святла, вясны, ад прылёту птушак, ад іх радасці... Няма ўзаемарадасці. І птушак цяпер няшмат. Але жаваранка чула ў небе — над возерам завіс. Ну і наш, лёсава прыліплы птах — грак.

У двары канторкі за лазняй — чародка зашэраных людзей. Яны вяла чакаюць звычайнай каманды — хто куды. У большасці — на цэнтр, вуліцу месці. Цэнтр у цэнтры ўвагі.

Я таксама чакаю. Начальніка канторкі, каб нешта сказаць яму асабіста. Бо канторка напоўненая бітком. Там і Франц Адольфавіч — з тварам, цёмным ад унутраных перажыванняў, хваляванняў, стрэсаў, і ўвесь у тэлефоне, у палкай, суровай, змрочнай размове, якая называецца «дзелавой».

— Кажыце хутчэй, што хацелі... А то няма калі.

— Хацела з вамі асабіста... на пяць хвілін...

— Тады чакайце на вуліцы!

Я навучылася спачуваць Адольфавічу. Ён падаецца мне асобай артыстычнай. Адольфавіч — чалавек тэлефоннай трубкі ўзмоцненага дзеяння, бо гэтага вымагае штодзённая роспач — «дзе ўзяць?». Невялічкі ростам, увесь з выканаўчым парывам, вёрткі, але на сёння не такі, што «ты мяне пад лёд, а я адтуль з рыбкай у руцэ». Не выходзіць! Ён бегавы, лятальны, засмечаны мястэчкова-жыхарскімі праблемамі.

Адольфавіч згадваецца мне на першым часе на пасадзе. Бяжыць насустрач, хапае з рук маю заяву, смяецца, абяцае тут жа разгледзець. Браўся за справу з надзеяй на талковы лад, на поспех, на ўдзячнасць і зверху, і знізу. Што ж выходзіць? Ды пра ніз і гаворкі няма... Усё ім латай, усё ў іх цячэ, усё ім холадна зімой...

Мяне асабіста Адольфавіч адратаваў ад штогадовага патопу на пятым паверсе, калі дом перайшоў з ведамства льнозавода ў ЖКГ. Ён ліквідаваў цечу са столі і загадаў пабяліць.

Але я мала калі звяртаюся ў канторку па асабістых пытаннях. Мяне чамусьці найбольш хвалюе іншае, на пагляд усяго начальніцкага свету наіўнае, нават ненармальнае пытанне. Ну што гэта за пытанне: не рэжце дрэвы з грачынымі гнёздамі. А я, вясковая жыхарка, пратэстую супраць таго, каб крыўдзілі вясну, крылатых стварэнняў, прыроду — Боскую прыгажосць. Пратэстую заўсёды, асабліва з таго часу, як раптам уся кіраўнічая Беларусь пачала няшчадна валіць і мястэчковыя, і вясковыя дрэвы. Найперш лепшыя, здаравейшыя, пасля ўжо другі гатунак.

Чаму нашы сельскія, блізкія да чалавека птушкі так шуганулі на чубкі высокіх вулічных аголеных дрэў, якія яшчэ засталіся ў Падсвіллі? Бо ўсё выразана. Аголеныя клады, старыя паркі (напрыклад, у Галубічах, за тры кіламетры ад Падсвілля). Звалены пад марку дазволу (планавага зразання) усе нягоршыя дрэвы: бярозы, клёны, каштаны, ясені, сосны. Урэшце і кволыя таполі ў большасці пазразаныя. Застаўся парк бярозавы, і сосны, і дубы ля возера. Што будзе з імі?

А на цэнтры вуліцы пакінуты зрэдку здаровыя рослыя дрэвы. Праўда, з паабразанымі да самай макаўкі стваламі. Але ж гэтыя дрэвы павінны застацца хоць для якога-небудзь ценю ў пасёлку, які некалі славіўся зялёнай прыгажосцю. Гракі селяцца на зручных для кладкі гнёздаў дрэвах. А тут ужо хутка ніякіх не будзе.

Птушкі гракі спрадвеку — сябры сельскага чалавека. Мы павінны ўжывацца з птушкамі волі крыху інакш, як з тымі, мяса якіх умінаем за дзве шчакі. Тыя ж якраз не павінны вольна хадзіць па дварах і вуліцах гарадскога пасёлка, як гэта ёсць на справе.

Мы, людзі, каб не здзічэць, не здзервянець і не задзірванець душой, павінны глядзець, акрамя як «пад ногі», яшчэ і навокал, і ў неба. Каб бачыць там жыццё на вяршалінах дрэў.

...Адольфавіч закіпае, пыліць нецэнзурна, крычыць, каб чулі ягоныя людзі, якая я неразумная.

— Вы б прайшлі тратуарам, вуліцай, вы б адчулі. Яны ж усё абас...

Не, дарагі Адольфавіч, гэта не птушкі «ўсё...». Птушкі толькі крыху пад дрэвамі... Бо гнёзды зверху. Ды колькі тых дрэў засталося на вуліцах? Птушыны памёт — угнаенне для росту травы. Гэта людзі «усё». А ў возера чаго наплыло? А ў прыазер'і, куды ні стань, смецце. А ў лес чаго навёз чалавек? А смецце гарпасялковае куды адвозіцца? Да рэчкі, якая цячэ ў возера? За Падсвілле ступіць няма як. З усіх бакоў хоць павязку на нос завязвай. З заходняга боку бераг лесу мазутай затоплены, смеццем завалены. І з возера ўсё плыве па рэчцы Свіліцы ў свет... А на паўночным усходзе, за Кішамі?

## Новая кампанейшчына: у вёсках пачалі масава валіць дрэвы. Дурасць і ганьба!

— Гной адпампоўваюць,— кажа жыхарка вёскі,— за ферму, пад лес. Вывозіць на палі — вялікія выдаткі. А так працай перагнаць. Гэткі заліў, пакрыты скарынкай... Неаднойчы людзі туды траплялі. Праўда, не ў адзіночку хадзілі. Адзін другога ратавалі.

— Гэта ж, вядома, не датычыць ЖКГ. У ведамстве камунальнай гаспадаркі — пасёлак, і ён не ў найлепшым стане: падвалы заліваюцца, лопаюцца каналізацыйныя трубы. На вадатрасе частыя паломкі, і ў лютым часам адключаецца ацяпленне, і мы сядзім ў холадзе. Прыборы ўліку вады паставілі, а гарачай няма, няма чым прамыць сістэму сцёкаў. Гэта што? Да цывілізацыі не адносіцца?

— Вы б бачылі, колькі гнёздаў на дрэве!..

— Пятнаццаць.

— Ну во!..

А дзе жыць птушкам? Правільна! Яны хутка насяліліся. Гракі ў працы больш творчыя, чым некаторыя людзі і ўсе падсвільскія працаўнікі ЖКГ разам узятыя. За гэта птушак і трэба любіць. Вунь якая прыгожая сяміпавярховая галінка гнёздаў цягнецца ў неба. Каб так людзі садзілі дрэвы, як гракі гнёзды. А зрэзаць дрэвы з гнёздамі — хвілінная справа. Дык што? Пустыняй зрабіць пасёлак, і ўсю віну спісаць на гракоў?

— Вы б чулі — ва ўсёй Еўропе самай шкоднай птушкай аб'яўлены грак.

Няўжо?! Вораг №1? Бач ты, у птушыным свеце вызначылі... А хто ж вызначыць у чалавечым найшкоднага?.. У нас ёсць раўнадушныя. Ёсць нават педагогі, якіх трасе ад жаб пасля дажджу. А ў цывілізаваных краінах робяць жолабы пад дарогамі, каб гэтыя стварэнні маглі перайсці, не трапіць пад колы. Ненавіснікаў гракоў, як відаць, нямала. Ён выклікае ў іх гідлівасць, бо харчуецца ў цяжкі час на сметніках. А што б яны прапанавалі граку? Якое меню? А выкінутыя людзьмі каты чым там харчуюцца? Можа, гэтыя людзі выхоўваліся на якой іншай планеце? Ці зусім не выхоўваліся?

— Чалавек мусіць рэгуляваць! — паведамляе шаноўны Франц Адольфавіч, намякаючы на сваё права высяляць птушак.

Прыроду ж мы ўжо адрэгулявалі, далей няма куды. Назад гатовыя вярнуцца. Ды як?

— Завал на працы! Вы кажаце — рэзаць восенню. Калі мне ўдаецца здабыць тэхніку, тады і рэжу!

Завал?.. Выбачайце! Не ведаю, чым дапамагчы. Разумею, што ўсё дзіравае, а латаць няма чым. Самому, як таму граку, трэба лазіць па сметніку — шукаць трубы кавалак, старой батарэі, штакеціну... А тут яшчэ — гракі! Так, я спачуваю Адольфавічу. Ну, гэтых верхніх ён здыме! Але пакуль дабярэцца, гнёзды на кожнай галінцы з'явяцца, і ў гнёздах — зноў птушаняты.

На Францыю, напрыклад, як кажа Адольфавіч, раўняцца можна. Але найперш, на культуру, аснова якой — французская мова. А ў нас дзе беларуская ў мястэчку?

Ды каля нас жа — цэнтр Еўропы. Хай на нас раўняюцца! — хочацца жартаваць, — усё ж першага красавіка. Толькі бачу, што жарты недасягальныя. Але

Я ж да вас, спадары, іду
Ад найлепшых трывог і дум —
Не ад нейкай пустой начынкі.
Не здзімайце з сябе пылінкі,
Калі тоўшчы ляжаць навокал
Пылу-ілу, як глянуць вокам,
І мікробаў хваробатворных...
Што той грак на галінцы, чорны?!

**Марыя Баравік, м. Падсвілле, Глыбоцкі раён**

## Пажэжынскае возера засталося без рыбы

**Мае пажэжынцы, а таксама шматлікія берасцейцы, якія ў свой час аблюбавалі Пажэжынскае возера, надта заклапочаныя, што пасля працяглае зімовае задухі ў возеры загінулі вялізныя карпы і карасі, акунь ды іншая рыбная драбяза.** Справа, як аказалася ў тым, што яшчэ з мінулага году ля возера красавалася табліца, дзе чорным па беламу было напісана, што ўсякая лоўля рыбы строга забароненая. А зімою гэтае папярэджанне спрацавала адмоўна. Рыбы аніхто не лавіў, продухаў не білі, з задухаю рыба сама не справілася. Па просьбе вяскоўцаў я пазваніў у абласную інспекцыю аховы жывёльнага і расліннага свету, дзе мне на мой клопат адказалі, што пра прыкрую сітуацыю на Пажэжынскім возеры ў інспекцыі ведаюць. Больш таго, параілі мне звярнуцца да старшыні Велікарыцкага сельсавета з пытаннем — чаго загінула рыба ў возера? — бо штучны вадаём знаходзіцца ў межах населенага пункта і што менавіта старшыня сельскага Савета не парупіўся ў зімовы час сагітаваць колькі мястэчкоўцаў для прабіцця продухаў на воднай роўнядзі.

**Уладзімір Барысюк, в. Пажэжын, Маларыцкі раён**

## У Дзісне збіраюцца разбурыць клуб, у якім выступаў Ігнат Буйніцкі

**У Дзісне плануецца знос як мінімум трох камянічак пачатку XX стагоддзя, між іншым, гарадскога клуба, у якім сто гадоў таму ладзіліся выступленні «бацькі беларускага тэатра» Ігната Буйніцкага.** Гэтыя планы чыноўнікаў «усплылі» на старонках абласной дзяржаўнай газеты «Народнае слова».

Там быў апублікаваны ліст жыхара Дзісны Фадзея Шымуковіча пра кепскі стан узведзеных напачатку XX стагоддзя будынкаў былой павятовай бальніцы, казначэйства і гарадскога клуба.

У адказе намеснік старшыні аддзела эканомікі Віцебскага аблвыканкама Святаслаў Зароўскі залічвае камянічкі да аб'ектаў, якія «спісаныя з уліку, але не знесеныя з-за адсутнасці сродкаў, патрэбных дзеля разборкі».

«Гарачае дзякуй шчыраму беларусу Ігнату Буйніцкаму, каторы, не шкадуючы сіл сваіх і працы, устроіў гэтую вечарыну і быў тутака першым танцорам! Дзісненскія беларусы доўга будуць помніць гэта», — пісаў жыхар Дзісны ў «Нашай Ніве» №35 за 26 жніўня 1910 года. Аўтар не мог прадбачыць, што акурат праз сто год у незалежнай Беларусі ад гэтай памяці можа не застацца і цагліны на цагліне.

**Кастусь Шыталь, Глыбокае**

## Ісландскі попел над выспай стабільнасці

**Выбух вулкана ў Ісландыі яшчэ раз нам усім паказаў, які малы свет.** Дзе тая Ісландыя, а з-за выкіду вулканічнага попелу адмяніліся па ўсёй Еўропе авіярэйсы. Ужо на трэці дзень ісландская хмара была над Беларуссю. Адарванасць нашай краіны ад вакольнага свету — ілюзія, якую спрабуе стварыць дзяржаўная прапаганда. Маўляў, у свеце бушуюць катаклізмы, але нас яны не кранаюць — выключна дзякуючы мудраму кіраўніцтву самі знаеце каго.

## Ладна надвор'е, але і палітыка, і эканоміка — цёмны лес для многіх беларусаў.

Ад гэтага людзі мала цікавяцца тым, што за мяжой робіцца. Ладна надвор'е, але і сусветная палітыка, і эканоміка — цёмны лес для многіх беларусаў. Папраўіць гэта можна, толькі падвышаючы ўзровень адукацыі народа. Тады людзі будуць самі разбірацца ў сусветных палітычных і эканамічных працэсах і стражэй патрабаваць ад кіраўніцтва, каб пільнавалася карысці краіны, а не ўласных інтарэсаў.

**Дзед Бялыніцкі**

## Міхалевіч і лісабонскае метро

**Праглядаў фотаздымкі лагатыпаў метро розных краінаў і натрапіў на дакладна такі, як эмблема прэзідэнцкай кампаніі Алеся Міхалевіча. Раю сп. Міхалевічу неадкладна змяніць лагатып, каб, крый Божа, прадстаўнікі лісабонскага метрапалітэна не падалі на яго ў суд. Хоць такое развіццё падзеяў мо і дадало б папулярнасці палітыку.**

**Уладзіслаў Грабавы, Мінск**

## Безалкагольная Радаўніца

**Выйшаў указ, які забараняе піць алкаголь у публічных месцах. А ў нас людзі прывыклі, пасля таго як бацюшка пасвянцае магілы, сустракацца раднёй вакол імправізаванага стала,** накрытага на зямлі ці на капоце машыны. Проста на ўскрайку могілак. Традыцыя здавалася непарушнай. Пэўна, міліцыя пойдзе на кампраміс, думаў я.

## Традыцыя здавалася непарушнай.

Але сёлета на могілках ніхто не піў. Пра ўказ усе знаші і штраф плаціць не хацелі. Прыбраўшы магілы і памаліўшыся за родных, проста раз'ехаліся. Хто хацеў — запрасіў сваякоў на гасцінны дахаты. Дый сапраўды: за сталом у хаце гаманіць зручней, чым на адкрытым усім вятрам пагорку магільніка.

**Зміцер Голуб, Валожын**



PHOTO.BYMEDIA.NET

## Пераможцы

Рушылі ў дарогу ваяры
Раніцою з патуханнем зорак,
Хмарыла ў ліпеньскі аўторак,
Злыя ўсхадзіліся вятры.




Усхліпнула князёўна на двары:
На вайну ідзеце, ваяры!
Секліся адважна змагары,
Горб вайны — скрываўлены пагорак,
Вострыя ў тэўтонцаў кіпцюры,

А дарэмна выхваляўся вораг,
Секліся адважна змагары.

Гінулі найлепшыя сябры,
Што заўжды сухім трымалі порах.
Полацак не ўбачаць — родны горад,
Не уздымуць ветразь на Дняпры,
Нёман — іншым панясе дары,
Згінулі найлепшыя сябры.

Спахмурнелы Вітаўт і стары
Узышоў на грунвальдскі пагорак
Памянуці — з пляшкі выбіў корак.
Светлы плач зязюлі у бары,
У чырвоных маках схіл гары...
...шэсць вякоў мінула з той пары...

**Алесь Сакалоў, Баркалабава**

«НН» з радасцю друкуе ў газеце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаванні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы не можам пацвярджаць атрыманне Вашых лістоў, не можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адраса. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Мінск.
e-mail: nn@nn.by.
Факс: (017) 284-73-29**

# Дастыш фантастыш

Новая кінакамедыя «Беларусьфільма»: такога раней не здымалі.

Назву пазычылі з дыялогаў улюбёных у народзе нямецкіх порнаактораў. Ідэю пафарбаваць танк у ружовы колер прысабечылі ў чэшскага мастака-правакатара Давіда Чэрнага. Фінал падцікавалі ў вясельным хаосе Эміра Кустурыцы. А мафіёзныя разборкі — у савецкіх «Прыгодах італьянцаў у Расіі».



Па кінатэатрах раскладзеныя флаеры з рэкламай фільма «Дастыш фантастыш». 23 красавіка ў клубе «Рэактар» пройдзе канцэрт, прымеркаваны да выхаду саундтрэка, у кінатэатры «Кастрычнік» усталяваныя стэнды з прарэзанымі адтулінамі для аматараў пафоткацца ў вобразе персанажаў фільма. Нарэшце «Беларусьфільм» усур'ёз сабраўся на братазабойчую, але справядлівую вайну ўсіх кінастудыяў супраць усіх кінастудыяў.

Нягледзячы на ўсе піяр-акцыі з выкарыстаннем паўторка, што «Беларусьфільм» да гэтай стужкі не мае ніякага дачынення», публіка злёгку не давярала. Як на пятнічны вечар і для прэм'еры ў кінатэатры «Кастрычнік» людзей было (каб не пакрыўдзіць стваральнікаў) — кампактна. Але ж аматары глядзець беларускае рэагавалі на кожны гэг.

Побач нехта як плюсы лічыў знаёмыя мясціны: гэтая сцэна ля Камсамольскага возера, тая — ля мікрараёна «Усход». Нават калі дрэвы зафантанавалі грашовымі знакамі, публіка, пільна ўзіраючыся ў іх, канстатавала: «а грошы не нашыя». Шумнымі авацыямі віталі знаходкі рэжысёра: кадр, калі, нібы галівудскі джып, з іскрамі і дымам эфектна ўзлятае ў паветра матацыкл маркі «Мінск».

З відавочных пераваг стужкі:

— ужо сама сабою цікавая завязка пра хлопца з чырвонай фрызурай, які прыехаў у Мінск і вырасціў грошавае дрэва. Мудрагелісты сюжэт дорыць нам шмат прыемных імгненняў: акт продажу Нацыянальнай бібліятэкі новаму беларусу, а таксама здачу ў арэнду будынка Валадарскай турмы натоўпу сімпатычных паўдуркаў.

З мінусаў:

— «Беларусьфільм» усё яшчэ саромеецца беларускай мовы, хаця ўсе задаткі для пераадолення гэтай спадчыны праклятага мінулага былі (шматлікая прысутнасць у кадры актораў Купалаўскага і пазакадравыя песні Лявона Вольскага).

Але такой бяды — доўгая дарога дадому. Проста, каб нараджаліся шэдэўры, такіх камедыяў мусіць быць 5—10 на год.

**Ліза Кавальчык**

# «Шэўрале» Купалы коштам 100 тысяч еўра

Аўто Купалы рэстаўравалі па асабістым загадзе міністра культуры Паўла Латушкі. Ён і прэзентаваў яго гледачам.

У выходныя машыну выкацілі на пляцоўку перад будынкам Літаратурнага музея імя Янкі Купалы ў Мінску.

Цяпер аўтамабіль належыць музею. Доўгі час ён стаяў у гаражы філіі ў Ляўках, але ў лістападзе 2009 года машына была перавезеная ў Мінск. Яе адрэстаўравалі з дапамогай кампаніі «Мінск-Лада» — афіцыйнага прадстаўніка Chevrolet у Беларусі.

Шыкоўны амерыканскі лімузін не быў першым аўтамабілем Купалы. У 1935 годзе кіраўніцтва БССР падаравала яму савецкі МК-1. Праз чатыры гады, у 1939-м, Панцеляймон Панамарэнка асабіста выпісаў Купалу «Шэўрале». Мадэль Chevrolet GA Master DeLuxe выпускалася толькі ў 1937 г. Усяго быў зроблены 2221 экзэмпляр. Цяпер кошт купалаўскага аўто перавышае 100 тыс. еўра. І гэта без увагі на тое, каму належаў аўтамабіль!

Менавіта на «Шэўрале» Купала ў чэрвені 1941 г. пакінуў Мінск, куды паэту ўжо не было наканавана вярнуцца.

Да 1955-га машына была на хаду, але ў 1957-м яе закансервавалі. Рэстаўраваць яе пачалі па даручэнне міністра культуры Паўла Латушкі. Пакуль «Шэўрале» зведаў толькі касметычны рамонт. У беларускім прадстаўніцтве Chevrolet выявілі жаданне цалкам аднавіць аўтамабіль, каб ён мог ездзіць. Аднак супрацоўнікі музея не пагадзіліся — у гэтым выпадку ён перастаў бы быць арыгінальным музейным экспанатам.

Супрацоўнікі музея адзначаюць, што Купала вельмі любіў свой аўтамабіль. Нават у Саюз пісьменнікаў прыходзіў з кнігамі па аўтамабільнай справе, аднак сам так і не сеў за руль.

**Алесь Пілецкі**




**Chevrolet GA Master DeLuxe належаў Янку Купалу.**

## Гісторыя як антыкварная крама

Калі пачытаць гістарычныя выданні савецкай эпохі, дык складаецца ўражанне, што сярэднявечная гісторыя — безупыннае змаганне паміж класам феадалаў і прыгоннымі сялянскімі масамі. З іншага боку, разгарнуўшы адраджэнскія кнігі, думаецца, што ў тыя часы нашую зямлю насялялі выключна вялікія князі і валявыя гетманы, якія толькі тое і рабілі, што заключалі ўрачыстыя хаўрусы і выходзілі на векапомныя бітвы...

У новай кнізе Вольгі Бабковай таксама ажываюць постаці беларускай гісторыі, але іншыя! Мінскі аптэкар Матыс Чаховіч, злотнік Людвіг Залатар, мешчанін Івашка Кузютыч... Вылавіўшы ў гістарычных (збольшага судовых) крыніцах XVI—XVII стст. людскія эмоцыі і дробныя дэталі жыцця, Бабкова рэканструюе побыт і паводзіны тагачасных людзей. Як высвятляецца, і тады людзі шукалі працу, перажывалі, жаніліся, адпісвалі сынам спадчыну, сварыліся і нават нецэнзурна лаяліся... У кнізе — пра вулкі старога Мінска, пра сярэднявечныя цэны, пра тагачаснае стаўленне да дзяцей.

У Вольгі Бабковай свой адказ на пытанне: « Як усё было?» Яна ператварае мінулае не ў самавітыя музейныя залы, а ў мілае бязладдзе антыкварнай крамы: тут асабістыя рэчы нашых продкаў, якія можна ўзяць, памацаць, прымерыць на сябе, адчуўшы сапраўдны водар мінулага. Дзіўная рэч: чытаючы пра злачынствы, цяжбы, сваркі, скаргі, пакручастыя жыццяпісы людзей, сэрца поўніцца адкрыццём — яны ж такія самыя, як мы (прынамсі, не лепшыя за нас)! І ўся беларуская гісторыя ператвараецца ў кранальную гісторыю асобна ўзятага беларуса... Чалавек ідзе!

Для аматараў кніга аздоблена кароценькім старабеларускім-беларускім слоўнікам штодзённых з'яваў і рэчаў.

**Лявон К.**




**Вольга Бабкова. ...І цуды, і страхі. Эсэ па гісторыі штодзённасці Вялікага Княства Літоўскага XVI—XVII стст.** Мінск: «Логвінаў» (серыя «Галерэя «Б»). 2010, — 150с., 500 ас.

## СЦІСЛА

### Фільм ураджэнца Баранавічаў у Канах

Фільм Сяргея Лазніцы «Шчасце маё» ўключаны ў конкурсную праграму Канскага кінафэсту. Фільм распавядае пра прыгоды кіроўцы-дальнабойшчыка, які збіваецца з трасы і губляецца ў расійскай правінцыі. Сыграў яго актор беларускага Тэатра юнага гледача Віктар Немец. Рэжысёр Сяргей Лазніца нарадзіўся ў Баранавічах у 1964 г. Праз год яго бацькі пераехалі ў Кіеў. Рэжысуры ён вучыўся ў Маскве, а цяпер жыве ў Нямеччыне. Наступная стужка, якую плануе зняць Сяргей Лазніца, — экранізацыя аповесці Быкава «У тумане». 63-і Канскі фэст пройдзе 12—23 мая.

### Пачалося выданне 23-томніка Івана Шамякіна

Складае яго выдавецтва «Мастацкая літаратура». Поўны збор твораў народнага пісьменніка трапляе ў катэгорыю сацыяльна значнай літаратуры, на якую летась было выдаткавана з дзяржбюджэту 2,5 млрд рублёў. Ці распрададзены наклад 8-томніка Шамякіна, які быў выдадзены некалькі гадоў таму, у выдавецтве адмовіліся паведаміць, спаслаўшыся на камерцыйную таямніцу.

радыё свабода
Тэл. (017) 266 39 52
СМС 391 22 24
svaboda@rferl.org
п/с 111, Менск, 220005, Беларусь
ад 28 сакавіка – новыя частоты, хвалі
06:00–08:00 6105 кГц 49 м 6120 кГц 49 м
18:00–20:00 7270 кГц 41 м 9725 кГц 31 м
20:00–22:00 6050 кГц 49 м 6105 кГц 49 м
22:00–24:00 5995 кГц 49 м 9405 кГц 31 м
612 кГц 490 м сярэднія хвалі
www.svaboda.org

### У БДУ пачнуць рыхтаваць пісьменнікаў

На спецыяльнасці «Літаратурна-мастацкая творчасць» будзе адкрыта пяць спецыялізацый: паэтаў, празаікаў, драматургаў, спецыялістаў па мастацкім перакладзе і крытыкаў. У дыпломе выпускнік будзе мець пазнаку «Спецыяліст па літаратурна-мастацкай творчасці». Набраць плануецца дваццаць чалавек, толькі пяць на бюджэтныя месцы.

### «Рок за Броў» пройдзе ў пачатку лета

Фестываль пройдзе 5 чэрвеня ў Сілічах. Уваход вольны. З Мінска будуць ездзіць бясплатныя аўтобусы. Хэдлайнеры фэсту — гурты «Воплі Відаплясава», «Без Білета», «Градусы».

### Памёр мастак Алег Елізараў

15 красавіка на 40-м годзе жыцця ў Салігорску сканаў мастак Алег Елізараў. Смерць наступіла ў выніку прагрэсуючай пухліны мозгу. Алег Елізараў — знакаміты полацкі авангардыст, вядомы сваім «белым стылем». У свае карціны да звычайных фарбаў мастак дадаваў яшчэ і будматэрыялы, напрыклад, крэйду.

**КМ, АР**

# Беларускі першадрукар працаваў у Лондане

Наш зямляк Ян Літвін выдаваў кнігі ў Вялікабрытаніі задоўга да Скарыны. Сістэму сігналізацыі для Брытанскай каралеўскай чыгункі таксама распрацаваў беларус. Англійскія арыстакраты святкавалі Дзень Волі 25 сакавіка... Пра беларускую прысутнасць у Вялікабрытаніі распавядае новая кніга Наталлі Гардзіенка.

**«Наша Ніва»: Якія першыя звесткі аб ураджэнцах беларускіх земляў, што трапілі ў Злучанае Каралеўства?**

**Наталля Гардзіенка:** Вядомая паўлегендарная асоба Яна Літвіна. Як сведчаць англійскія крыніцы, гэты John Lettou прыкладна ў 1480 годзе адчыніў друкарню ў лонданскім Сіці ля царквы Усіх Святых. Тады той раён займалі юрысты, то Літвін спецыялізаваўся на выданні праўных дакументаў па-англійску. Гэта быў першы выхадзец з беларускіх земляў, аб якім захаваліся вартыя даверу дакументы. Трэба адзначыць, што ўласна англійскі першадрукар Какстон распачаў сваю дзейнасць усяго на тры гады раней.

Пазней ужо шмат хто наведваў Лондан: магнаты, дыпламаты, вандроўнікі. Асабліва часта наведваліся на выспы Радзівілы. Хтосьці як эмігрант палітычны, хтосьці як эканамічны. Хтосьці праездам — як Багуслаў, якога выкінула на англійскі бераг бура, калі ён плыў у Галандыю.

А ў XVIII—XIX стагоддзях Брытанія стала краінай з вялікім навуковым і прамысловым патэнцыялам. Часта было так, што ўраджэнцы беларускіх зямель маглі рэалізаваць свае задумы толькі там. Быў такі Ян Юзаф Бараноўскі са Смілавічаў, які распрацаваў сістэму чыгуначнай сігналізацыі. І яна выкарыстоўвалася на брытанскай чыгунцы на працягу ўсяго XIX ст.

**«НН»: Але гэта ўсё яскравыя асобы. Калі ў Вялікабрытаніі з'явілася беларуская супольнасць?**

**НГ:** У другой палове XIX ст. пачалася вялікая хваля эканамічнай эміграцыі з Расійскай імперыі. У большасці гэта былі ўраджэнцы Беларусі і Украіны. Прыязджалі ў Брытанію з рознымі мэтамі. Хтосьці трапляў выпадкова — людзі плацілі махлярам з параходных кампаній вялікія грошы за дарогу да Амерыкі, а тыя іх пакідалі ў Англіі. Шмат хто нават і не ведаў, што да жаданага берага цэлы акіян — жылі ў шчырым перакананні, што знаходзяцца ў ЗША.

Перасяленцы траплялі ва ўсходні Лондан, дзе ўтварыўся імігранцкі раён, населены выхадцамі з Расійскай імперыі. Шмат габрэяў і беларусаў там жыло.

Займаліся некваліфікаванай працай. Але тым не менш, захоўвалі свае звычаі. Найбольш рэлігію, зразумела. Дзейнічалі праваслаўныя цэрквы. Менавіта па запісах у царкоўных кнігах і магчыма аднавіць многія моманты з жыцця беларускіх імігрантаў у Лондане.



Міс Беларусь Соф'я Кляйнова, 1976.

**«НН»: Ці проста было тагачаснаму гастарбайтару аформіць дакументы на выезд?**

**НГ:** У Расійскай імперыі стварaліся штучныя складанасці для выезду за мяжу. Было неабходна набыць пашпарт, аформіць яго адмысловым чынам. Гэта каштавала вялікіх грошай. Таму афіцыйная эміграцыя значна адрознівалася ад рэальнай. Існавала вельмі вялікая колькасць нелегальных эмігрантаў. Ехалі на сезонныя працы ў асноўным. Вялікабрытанія была хутчэй транзітнай краінай. Праз яе кіраваліся ў ЗША, Канаду, Аргенціну.

Выезд, нават нелегальны, каштаваў дорага. Шматлікія параходныя кампаніі рэкламавалі свае паслугі. У афіцыйным друку, у сваю чаргу, з'яўляліся час ад часу папярэджанні аб небяспецы эміграцыі. Нешта накшталт сучаснай рэкламы аб небяспечнасці працы за мяжой, якую мы бачым з экранаў дзяржаўных каналаў.

**«НН»: Што змяніла вайна? Якой была паваенная эміграцыя з Беларусі ў Вялікабрытанію?**

**НГ:** Паваенных перасяленцаў адрознівала выразная беларускасць. Былі розныя шляхі з'яўлення імігрантаў: праз удзел у польскім войску (пераважна выхадцы з Заходняй Беларусі, якія праз Сібір трапілі на Брытанскія выспы), праз сваяцтва (сваякі беларускіх жаўнераў польскага войска, пераважна дзеці і жанчыны) і самая невялікая група — перамешчаныя асобы часоў вайны.

Увогуле ў паваенай Брытаніі былі не вельмі спрыяльныя ўмовы для перасяленцаў і ўцекачоў. У адрозненне ад іншых еўрапейскіх краін, Брытанія запрашала выключна асоб працаздольнага ўзросту з добрым здароўем.

**«НН»: Існуе стэрэатып, што беларуская паваенная эміграцыя — гэта былыя паліцаі. Наколькі гэта адпавядае рэчаіснасці?**

**НГ:** Брытанія абвяргае гэты стэрэатып. На 80% гэта былі былыя жаўнеры польскага войска, людзі, якія гэтаксама змагаліся з фашызмам, як і тыя беларусы, што служылі ў Чырвонай Арміі.

Была група беларусаў, што далучылася да польскага войска толькі ў 1944 годзе. Але гэта былі найчасцей былыя ўдзельнікі Саюза беларускай моладзі, а не паліцаі.

**«НН»: У чым бачылі сваю задачу паваенныя беларускія арганізацыі ў Вялікабрытаніі?**

**НГ:** Найбольш вядомай і значнай з'яўляецца Згуртаванне беларусаў у Вялікабрытаніі. Яно ўзнікла ў 1946 годзе і дзейнічае не толькі ў Лондане, але і па ўсёй краіне: у Манчэсцеры, Брэдфардзе, Бірмінгеме, Ковентры.

Вылучае ЗБВБ сярод іншых арганізацый беларускай эміграцыі тое, што яно здолела прыдбаць сабе даволі шмат нерухомасці па ўсім каралеўстве і добра яе скарыстаць.

Цікава, як гэта адбывалася. У 1960—1970-я ў Манчэсцеры і Брэдфардзе існавалі беларускія клубы, якія карысталіся тым, што ў той час у Вялікабрытаніі існавала абмежаванне на продаж алкаголю ў пабах. Але яно не датычыла клубаў. У выніку сталымі наведнікамі беларускіх клубаў амаль на 80% былі звычайныя брытанцы, што прыходзілі туды прапусціць шклянку-другую. А беларусы на заробленыя такім чынам грошы выдавалі часопісы, кнігі, падтрымлівалі ініцыятывы не толькі ў Вялікабрытаніі, але і ў Беларусі.

Сярод іншых арганізацый трэба адзначыць Беларускую каталіцкую місію ўсходняга абраду, якая стварыла ўнікальны беларускі асяродак у паўночным Лондане са святарскім домам і бібліятэкай.

Варта згадаць і ўнікальнае Англа-беларускае таварыства. Яго стварылі сумесна беларусы і брытанскія арыстакраты. Для іх Беларусь была экзотыкай, і гэта прыцягвала. З дапамогай таварыства адбываліся прыёмы на найвышэйшым узроўні. Часам святкаванні ўгодкаў незалежнасці Беларускай народнай рэспублікі ладзіліся ў Брытанскім парламенце. Гэта, напэўна, найвышэйшы ўзровень, на які ўздымаліся беларусы ў Еўропе.

**«НН»: Ці складана было беларусам тады інтэгравацца ў англійскае грамадства?**

**НГ:** Большасць з тых, хто трапіў на Туманны Альбіён пасля вайны, пачыналі з некваліфікаванай працы. Аднак былі і выключэнні. Адзін з цікавых прыкладаў — Ян Дамінік. Ён жыў у Лондане і паспяхова займаўся нерухомасцю, валодаў адразу некалькімі будынкамі ў самых прэстыжных раёнах. На пачатку 1990-х, як Беларусь стала незалежнай дзяржавай, адзін са сваіх будынкаў ён прапанаваў беларускай амбасадзе бясплатна. І яна там месцілася да сярэдзіны 90-х. Пасля рэферэндуму аб змене нацыянальнай сімволікі жонка ўжо памерлага на той час Яна Дамініка папрасіла амбасадара вызваліць памяшканне. Беларускім уладам прыйшлося шукаць новы будынак для прадстаўніцтва.

**«НН»: Як упісалася сучасная хваля эміграцыі ў жыццё беларускай грамады Вялікабрытаніі?**

**НГ:** Пасля абвяшчэння незалежнасці Беларусі цікавасць у брытанскіх беларусаў хутка замянілася расчараваннем. Сапраўдная Беларусь аказалася зусім не такой, як яны чакалі. У Брытанію пачалі прыязджаць беларусы, якія нават па-беларуску не размаўлялі. Новыя эканамічныя эмігранты далучаліся да актыўнага грамадскага жыцця дыяспары не так актыўна, як паваеннае пакаленне. Таму сёння па-ранейшаму ядро беларускіх арганізацый утвараюць людзі старой хвалі, такія, як апостальскі візітатар для беларусаў-католікаў замежжа Аляксандр Надсан, што апякуецца ўнікальнай бібліятэкай Скарынаўскага цэнтра; кіраўнічка ЗБВБ Лёля Міхалюк. Тым не менш, прадстаўнікі новай хвалі складаюць прыкладна палову ад складу сённяшняй арганізацыі. І менавіта ад іх дзейнасці залежыць будучыня культурнага і інтэлектуальнага патэнцыялу, назбіранага папярэднікамі.

**Гутарыў Алесь Пілецкі**

**Радзівіл — парушальнік пашпартнага рэжыму**

Карабель Багуслава Радзівіла, які ў 1639 плыў у Галандыю, бура выкінула на англійскі бераг. Беларускі магнат выкарыстаў гэта як нагоду наведаць Лондан, дзе яго прыняў кароль Чарльз I Сцюарт. А ў наступным годзе, вяртаючыся праз Англію ў Францыю, Багуслаў быў затрыманы за тое, што не меў пашпарта.

**Будны: лісты ў Англію**

Сярод прыкладаў першых беларуска-брытанскіх сувязяў можна назваць ліставанне Сымона Буднага з англійскім гісторыкам Джоанам Фоксам. Адзін з лістоў беларускага асветніка ад 4-га траўня 1574 г. з уласным подпісам аўтара захоўваецца ва ўніверсітэцкай бібліятэцы ў Оксфардзе.

**Панятоўскага расчараваў парламент**

Станіслаў Аўгуст Панятоўскі так апісваў свае ўражанні ад наведвання брытанскага парламента: «Я быў нямала расчараваны, убачыўшы, што тая зала, якую я ўяўляў сабе такой велічнаю, значна больш сціплая паводле аздаблення і прыгажосці, чым палата нашага Сената».



Уладыка Чэслаў Сіповіч з Маргарэт Тэтчар.



**Наталля Гардзіенка**

Гісторык, даследчык гісторыі беларускай эміграцыі. Аўтар кніг «Беларусы ў Аўстраліі», «Беларусы ў Вялікабрытаніі».

**Беларусы ў Вялікабрытаніі / Наталля Гардзіенка; пад рэд. А. Гардзіенкі. — Мінск: Медысонт, 2010. — 620 с.** — («Бібліятэка Бацькаўшчыны»; кн. 18).

У выданні разглядаецца гісторыя беларуска-брытанскіх кантактаў, шляхі і матывы прыезду нараджэнцаў беларускіх земляў у Вялікабрытанію. Найбольшая ўвага надаецца дзейнасці пасляваеннай хвалі беларускай іміграцыі ў гэтай краіне.

Ідэя стварэння кнігі нарадзілася ў 2005 г. у сяброў Згуртавання беларусаў у Вялікабрытаніі па азнаямленні з першай кнігай аўтара — «Беларусы ў Аўстраліі».

Кніга Наталлі Гардзіенкі — сапраўдная энцыклапедыя беларускага жыцця ў Вялікабрытаніі. Пачытаць яе цікава будзе не толькі навукоўцам, але і ўсім, хто цікавіцца айчыннай гісторыяй, беларускай прысутнасцю ў свеце і любіць чытаць пра вандроўкі. Кніга можа з поспехам выкарыстоўвацца ў якасці турыстычнага дапаможніка тымі, хто збярэцца ў падарожжа на Брытанскія выспы.

Прэзентацыя кнігі адбылася 17 красавіка ў Беларускім доме ў Лондане (52, Penn Road, London).

# Айчына кантрабанда

**Павал Касцюкевіч.** Апавяданне.




PHOTO.BYMEDIA.NET

Ашмянскія цёткі ніколі не спяць. Пасля чаўночнага рэйса ў Вільню, ужо ў родных Ашмянах, яны дастаюць мужа з шафы, кормяць яго, здзімаюць пыл, мяняюць шкарпэткі і вешаюць назад, пад цэлафанавы чахол. Потым ідуць на працу, сядаюць за стол пад партрэтам, налічваюць квартальную прагрэсіўку ўсяму калектыву і — назад, на лінію фронту.

Ашмянскія цёткі зняважаюць законы прыроды: з электрычнай разеткі яны выцягваюць цэлую торбу мухаляпак, схаваны пад майку аполак сала падчас асабістага нагляду сілай волі ўжыўляюць сабе пад скуру, а віно ператвараюць у ваду.

— Марыечка, а ты ў гродзенскім пасольстве (гэтак яны называюць літоўскае консульства ў Гродне) даўно была?.. — пытаецца ашмянская цётка адразу пасля таго, як на квадратных вачах двух студэнтаў ЕГУ прайшла скрозь сценку купэ. Кажучы гэта, яна з ног да галавы ўвешваецца кабанасам ашмянскага мясакамбіната. (Як добра, што ў Ашмянах няма «Белшыны»!)

Марыечка, што матэрыялізавалася ў вагоне крыху пазней, не адказвае, бо занятая: па-шахідску абмотваецца хіт сезона, апошняя бомба 20-кілаграмовым патранташам з крэмам для твару «Балет».

І атрад спецыяльна навучаных сабак-шукаек таксама разводзіць рукамі: не бачылі, гаў-гаў, не чулі, не ўнюхалі.

Акропаліс, літы, чэйндж, акцыя — словы ашмянскіх цётак точацца мовай старажытных друідаў, якія на злосць шматвекавым захопнікам выжылі і цяпер просяць у праваднiцы кіпню.

За мяжой жыццё ашмянскіх цётак мінае ў раскошы літоўскіх супермаркетаў і гуртовых складоў, дзе да нябёсаў узносяцца сырныя горы, парванымі кабелямі гойдаецца кракаўская, а мінералка за 2.65, і ўсё-ўсё-ўсё... Хрыстос прызямліўся ў Вільні.

І дзівосныя паўліны пяюць у мясных аддзелах. Малако мяшаецца з мёдам, на пластыкавай пальме спеляцца сапраўдныя фінікі. Гронкі бананаў сыплюцца з усіх амерык свету, а плады ківі, як калядная версія бульбы, ляжаць буртамі да неба.

А хто там ідзе? Даначка, Марыечка, Тарэсачка і Айка. Берагі Вяллі расцвітаюць цудоўнымі садамі Радзімы — пры падыходзе да касаў прозвішчы на бэджыках касірак лагаднеюць, раднеюць. Мацкевіч, Зубарэвіч, Касцюкевіч, Лабуцька і Качуня.

Ашмянскія цёткі жывуць згодна з прынцыпам: «купляйце (і адразу прадавайце) беларускае». Па дарозе назад снедаюць чырвонай рыбай, закусваючы літоўскім «грыльяжам». Patria o muerte? Я выбіраю смерць, бо начорта такое жыццё, дзе будзе толькі прадукцыя фабрыкі «Камунарка».

Ішлі 89-я суткі візы. Нечаканае і ад таго зыркае сонца засляпіла вочы: мяжа! Пад'ём: ашмянскія цёткі па доўгу службы падфарбоўваюць перад кантролем вусны, або наадварот — змятаюць з твару ўсе сляды жаноцкасці (у кожнай свая мятода). Па савецкім яшчэ самавучыцелі «Таемная зброя пентагонаўскай прапаганды» фліртуюць з літоўскімі мытнікамі і памежнікамі, што, змакрэўшы, лічаць бясконцыя штампікі ў іх пашпартах.

— Сколько раз за эту визу вы приблизительно пожалуйста пересекали границу?

— Сорак сем.

— А что пожалуйста везёте?

— Хну.

— Что пожалуйста?

— Хну.

— Кто?

— Я.

— Вы?

— А то хто! Цяпер мая чарга: хто вы па знаку Задыяка?

— Понятно, понятно. Можетэ пожалуйста не открывать.

— Спасібачкі. І, калі ласачка, пастаўце мне штампік на 26-ую странічку...

Ашмянскія цёткі ненавідзяць студэнтаў-егэушнікаў, бо як можна галасаваць супраць, вучыцца супраць, калі наўкола такая радасць і сынок Жэнечка ў Мінску, на трэцім курсе наргаса.

«Жэнечка, сыночак, шосты вагон, прыгожая такая праваднiца, — цяпер кажа Айка ў мабільны, па-змоўніцку падміргваючы згаданай вышэй праваднiцы. — Ага, вантрабянку передала і мегаснікерс у асобным чамадане. Забярэш. Стаянка ў Мінску дваццаць хвілін».

**Ашмянскія цёткі жывуць згодна з прынцыпам: «купляйце (і адразу прадавайце) беларускае».**

Айка пакідае прыгожай праваднiцы вантрабянку і чамадан ды выходзіць у Ашмянах. Але яшчэ ў Смаргоні да прыгожай праваднiцы завітвае сяброўка з суседняга вагона: яны выпіваюць па сто каньяку на вішні і закусваюць пальцам пханай вантрабянкай. І таму ў Мінску сын Айкі атрымлівае ссохлае нешта-нейкае, няўежную куплёнку. Падмена выкрываецца: тады наступным разам Айка ў перадаваную вантрабянку кладзе гайку. Тады праваднiца, якая праз выламаны зуб мудрасці страціла сяброўку, наступным разам робіць кропкавую наводку. І элітнае аддзяленне мытні па пошуку памежных далікатэсаў хутка і лёгка выбаўляе са страўніка Айкі оптавыя колькасці атруты ад мышэй ды сто ўпаковак віцебскага валідолу і выводзіць Айку на перон, пагаварыць. Тады жывая і палягчэлая ў выніку той размовы на дзве столітавыя купюры Айка наступным разам пры пасадцы ў вагон падкладае ў купэ прыгожай праваднiцы шыферныя цвікі. Тады, страціўшы навыкі сядзення, наступным разам праваднiца бярэ і... Але ўсё па парадку...

Начны разбой, здрада, забойствы, рабунак — усе гэтыя з'явы адбываюцца ў рэальнасці і таму адлюстраваныя ў мове. Учынку ж прыгожай праваднiцы нават не знаходзіцца назвы, бо гэты ўчынак горшы нават за Чыкацілаў. Прыгожая праваднiца запрадала святы абшчак, стуканула на ўсю дзявочую арцель разам. Паказала мытнікам схованку на дзвесце бутэлечак кантрабанднага шампуню. І сама ж, сучка, у долю ўвайшоўшы была! «Там, там, таварыш капітан, далібог, на столі, за вентыляцыйнымі кратамі, толькі за якімі — дык не скажу. Не я хавала».

Вось яны перад аблічам святой інквізіцыі стаяць: Марыечка, Даначка, Тарэсачка і Айка. На якую ні глянь — усе пагалоўна сумленне нацыі, а іх маўчанне глыбокае, як возера Балдук. Мытнікі зганяюць пасажыраў з наседжаных месцаў і, пераможна сцяўшы зубы, адкручваюць вентыляцыйныя краты. І ў гэтай цішыні, дзе чуваць, як аб задушлівае паветра вагона б'юцца анёльскія крылы ашмянскіх цётак, здрадніцкі жывот Тарэсачкі з'едліва буркоча: «А вось у Шчорсах украінскія мытнікі адкручвалі прадухі за восем секундаў».

Мытнік з адкруткай на верхняй паліцы перастае пачувацца бравым тэхнікам «Формулы-1», які пайшоў на рэкорд на хуткаснай змене шынаў. Яго толькі што прынізілі да статусу ідыёта-перароcтка, што калупаецца пластмасавым шуфлікам у пясочніцы. Мытнік мае вочы зацкаванай панды, якой няма чаго губляць. Ой, Тарэсачка, што ж ты нарабіла...

Пад рулямі казённых калаўротаў ашмянскія цёткі па ўсім вагоне самі адкручваюць вентыляцыйныя краты.

— Бачу, бачу! — крычыць з далёкага канца вагона Айка.

— Шампунь?! — радасна выгуквае мытнік.

— Неба!

Злосны, як кракадзіл, мытнік сунецца ў той канец, каб пакараць словалюбную тарбочніцу. Але паспявае пабачыць толькі яе азадак у палонцы вентыляцыйнай шахты. Ногі Айкі звіваюцца, як вадзяныя змеі. Тулава ж, падуладнае невядомай сіле, пакрысе ўвінчваецца ў адтуліну. Айка бы тая з анекдота пчала, выгадаваная прагрэсіўнымі бээсэсэраўскімі пчалярамі да памераў слана, «у ляток пішчыць ды лезе». Мытнік спахопліваецца, але не паспявае ўхапіць яе, Айчыны пяты спрытна знікаюць у вентыляцыйнай адтуліне.

І вось Айка па той бок акна: крамяная, мажная, у соусе цягніковага дыму. Смачна лунае ў паветры літоўскім цэпелінам. Яе ногі весела збіваюць вакзальнае паветра на казіны сыр. Айка круціць праз шыбу мытнікам дуліну, а на поясе трымае торбу кантрабандных шампуняў.

— Семафорны мост, яна ўчапілася за семафорны мост над вагонам! — бурчыць няўрымслівы Тарэсаччын жывот.

Але тут па завэдзганым экране акна пралятае грымотны тавярняк. Та-тах-тах-тах, та-тах-тах-тах — сто сценабітных таранаў у кірунку далёкай брамы Брэсцкай крэпасці. Грукат аціхае. Ашмянскім цёткам і гудагайскім мытнікам вочы засціць жалобная ашаломленасць. Няма больш Айкі — над каляінай лунае толькі сузор'е малых бурбалак. У іх зіхцяць маленькія тварыкі Айкі, на якіх усмешкай чашырскага ката застыла кплівая грымаса. Вецер ненавязліва так зносіць тыя бурбалкі ў бок літоўскай мяжы.

— Яна паспела залезці на арматурыны маста! — зноў заходзіцца жывот Тарэсачкі.

Седзячы на семафорным мосце, упараная ад міжвольнай гімнастыкі, Айка зноў усміхаецца сяброўкам і памежнікам і непаслухмянымі пальцамі выкручвае дулю. У другой руцэ сутаргава сціскае адзіную ацалелую бутэлечку «Дароў Палесся». Густы шампунь на выхадзе ператвараецца ў бязважкія бурбалкі, не раўнуючы матылёк з кокану.

Адзін з мытнікаў траціць прытомнасць.

І тут з глыбіняў космасу прылятае вогненная камета — запозненая рэакцыя Галактычнага розуму, які ўсё ГЭТА і стварыў, а цяпер чыста па-чалавечы стаміўся. Бо як так можна — столькі гадоў з насельнікамі нашай планеты было ўсё ў парадку — усяленская туга, мукі душы. А тут, бач ты: праз сценкі людскога вагона прашыліся ашмянскія цёткі і нахабна разгайдалі светабудову. І камета дашчэнту выпальвае Айку з цэлым кавалкам семафорнага моста. Уф, ну, нарэшце...

Развярнуўшыся ў Вільні, асірацелы без ашмянскіх цётак цягнік бяжыць ад літоўскай мяжы праз сібірскія снягі на Усход, у сэрца нашай Радзімы, у Магілёў. У вагоне ціха падае снег. Прыгожая праваднiца, стоячы, рыдае — выбуховай хваляй камета выбіла шыбу ў яе купэ, і кантрабандны пітон, схаваны пад ложкам, спруцянеў на марозе. На месцах, указаных працаўнікамі састава, сядзяць выключна ўнутрырэспубліканскія пасажыры. Пра існаванне замежных краін яны чулі адно з бяскроўных вуснаў тэлевядучай. Яны нічога не ведаюць пра вадаспады і фантаны віленскіх гіпермаркетаў, пра мегатруфелі ўвышкі з піраміду Хеопса, пра тое, што ёсць на грэшнай зямлі такія Даначка, Марыечка і Тарэсачка, — і што была такая Айка.

І толькі ля самай падлогі, між батарэяй і ложкам адной з баковак, праз усе слаі дэрмаціну і жалезяка, поячы наваколле дзівосным водарам, зіхціць нязгасным рубінавым святлом надзейна забытая «Папараць-кветка», для ўсіх тыпаў валасоў, персанальная Айчына кантрабанда.







# «Океан Ельзи» прэзентуе новы альбом у шасці беларускіх гарадах

Украінскі гурт «Океан Ельзи» наведае Беларусь у маі ў рамках тура ў падтрымку новага альбому «Dolce Vita». Беларускі маршрут украінскіх музыкаў выглядае наступным чынам: **Бабруйск (11 мая)**, **Мінск (12 мая)**, **Баранавічы (15 мая)**, **Гродна (16 мая)**, **Гомель (18 мая)**, **Брэст (19 мая)**.

А **22 мая** «ОЕ» выступяць разам з Гаранам Брэгавічам у якасці хэдлайнераў на трэцім рок-фестывалі «Stare Misto» **у Львове**. 8-гадзінны канцэрт пройдзе на мясцовым стадыёне «Украіна». Горан Брэгавіч прывязе ў Львоў сваю новую праграму «Alcohol». Кошт квіткоў пачынаецца ад 40 грывен (каля $5).

Гурт «Океан Ельзи» быў створаны напрыканцы 1994 г. у Львове. У 1998 г. музыкі пераехалі ў Кіеў. Тады ж быў запісаны дэбютны альбом «Там, де нас нема», які прынёс гурту славу і вядомасць не толькі ў сваёй краіне.

**СП**

## ВЫСТАВЫ

### Галерэя гістарычных дзеячаў Марачкіна

Да 70-годдзя мастака Аляксея Марачкіна прымеркаваная яго выстава «Постаці гісторыі і культуры Беларусі». На ёй будзе выстаўлена каля трыццаці графічных палотнаў. Гэта і даўно знаёмыя вобразы Кастуся Каліноўскага, Міхала Клеафаса Агінскага, і новыя працы. Можна ўбачыць выявы асобаў, якіх мала хто маляваў. Паўстанка Эмілія Плятар, генерал Булак-Булаховіч, рэвалюцыянерка Палута Бадунова. Мастак асобна адзначае партрэт маладога Францішка Скарыны, які лічыць сваёй адметнай працай. **Выстава адкрыецца 23 красавіка ў 18.00 на сядзібе БНФ (пр.Машэрава, 8).** Працаваць яна будзе на працягу месяца.

**КМ**

### Пагоня на Грунвальд

**У дзіцячай бібліятэцы №10 (пр.Незалежнасці, 123, корпус 3) да 2 мая** працуе мастацкая выстава, прымеркаваная да 600-годдзя Грунвальдскай бітвы.

### Амбівалентнае

**Да 25 красавіка ў галерэі «Ў» (пр.Незалежнасці, 37а)** працуе выстава Жанны Гладко «Амбівалентнае». Праца задумлялася як развагі пра дваістае ўспрыманне свету. Амбівалентнае падкрэслена на ўсіх узроўнях інсталяцыі: ад выбару матэрыялаў і іх кантраснага спалучэння да падбору і інтэрпрэтацый вербальных сувязяў.

### Паэт рэпартажу. Рышард Капусцінскі

**У Гістарычным музеі (вул. Маркса, 12) да 10 мая** працуе выстава «Паэт рэпартажу. Рышард Капусцінскі». Дакументы, фатаграфіі, газетныя публікацыі, кнігі, размешчаныя на выставе, раскажуць пра цікавую асобу — Рышарда Капусцінскага.

### Жывапіс у Нармандыі

**У Мастацкім музеі да 25 мая** працуе выстава «Жывапіс у Нармандыі». Гэты ўнікальны збор твораў мастацтва вандруе па свеце як калекцыя, якая паказвае зараджэнне імпрэсіянізму ў Францыі.

### Накіды і малюнкі расійскіх мастакоў

**Да 24 красавіка ў Мастацкім музеі** працуе выстава «Накіды і малюнкі рускіх мастакоў XIX—XX стст. са збораў музея». На выставе прадстаўленыя накіды І.Шышкіна, Я.Волкава, Б.Кустодзіева, Ф.Малявіна, К.Рудакова, В.Сярова. Большая частка графічных лістоў экспануецца ўпершыню.

### Халодная зброя

**У музеі Вялікай Айчыннай вайны да 1 чэрвеня** працуе выстава «Халодная зброя. Традыцыі і сучаснасць».

### Ваенна-гістарычная мініяцюра

**У Гістарычным музеі да 30 мая** працуе выстава Ігара Гарбунова «Ваенна-гістарычная мініяцюра». На выставе прадстаўленыя мініяцюры воінаў Старадаўняга Рыма, галандскіх воінаў…

## ТЭАТРЫ

### 21 красавіка

**Тэатр імя Горкага** — «Ідэальны муж»
**Музычны тэатр** — «Марыца»
**Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі** — «Вандроўнікі ў Нью-Ёрку»

### 22 красавіка

**Тэатр оперы і балета** — «Трубадур»
**Тэатр імя Горкага** — «Дзядзькаў сон»
**Тэатр юнага гледача** — «Сіні аўтамабіль»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Містэр Розыгрыш»

### 23 красавіка

**Тэатр оперы і балета** — «Севільскі цырульнік»
**Тэатр юнага гледача** — «Мешчанін у шляхецтве»
**Купалаўскі тэатр** — «Вячэра з прыдуркам»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Шлях у Царград»
**Тэатр імя Горкага** — «Анджэла і іншыя»

### 24 красавіка

**Тэатр лялек** — «Мыйдадзір»
**Тэатр юнага гледача** — «Шытая лялька Рэгедзі Эн»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Чорны квадрат»
**Тэатр імя Горкага** — «Васа»

### 25 красавіка

**Тэатр лялек** — «Піпі-Доўгаяпанчоха»
**Тэатр юнага гледача** — «Бармалей»
**Тэатр імя Горкага** — «Зоркі сёмага неба»
**Тэатр імя Горкага** — «Ніначка»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Чарнобыльская малітва»

### 26 красавіка

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Загадкавыя варыяцыі»

### 27 красавіка

**Тэатр юнага гледача** — «Маскарад»
**Тэатр імя Горкага** — «Валянцінаў дзень»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «П'емонцкі звер»
**Тэатр оперы і балета** — «Набука»

### 28 красавіка

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Жанчыны Бергмана»
**Тэатр юнага гледача** — «Маленькія трагедыі»
**Тэатр оперы і балета** — «Іаланта»
**Тэатр імя Горкага** — «Уяўны хворы»

### 29 красавіка

**Купалаўскі тэатр** — «Не мой»
**Тэатр оперы і балета** — «Алека»
**Тэатр беларускай драматургіі** — «Сталіца Эраўнд»
**Тэатр юнага гледача** — «Нататкі звар'яцелага музыкі»
**Тэатр імя Горкага** — «Пане Каханку»

### 30 красавіка

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Адэль»
**Купалаўскі тэатр** — «Не мой»
**Тэатр імя Горкага** — «Сыходзіў муж ад жонкі»
**Тэатр імя Горкага** — «Жаніхі»

## КІНО

### Акіра Курасава

**У Музеі гісторыі беларускага кіно (вул.Свярдлова, 4)** — рэтраспектыва фільмаў рэжысёра Акіры Курасавы «Імператар японскага кіно», прысвечаная стагоддзю з дня яго нараджэння. **21 красавіка** — «Пад стук трамвайных колаў»; **23 красавіка** — «Цень воіна»; **28 красавіка** — «Смута»; **30 красавіка** — «Сны». **Пачатак сеансаў а 15-й і ў 18.30.**

# «Бітва тытанаў»




**Бітва тытанаў (Clash of the Titans)**
ЗША — Вялікабрытанія, 2010, каляровы, 3D, 118 хв.
**Рэжысёр:** Луі Летэр'е
**Жанр:** Фантастычныя прыгоды паводле грэцкіх міфаў і аднайменнага фільма 1981 года
**Адзнака:** 5,5 (з 10)

Персей — выхаваны людзьмі сын Зеўса. Але ягоных прыёмных бацькоў забівае Аід. Алімпійскія багі помсцяць людзям за непаслухмянасць, наслаўшы марскую пачвару Кракена, які мусіць разбурыць горад Аргас і зжэрці прынцэсу Андрамеду. Персей выпраўляецца ратаваць людзей.

Спецназавец з «Аватара» Сэм Уортынгтан б'ецца з Медузай Гаргонай, адпраўляецца ў Тартар, абараняе красуняў (аж дзвюх).

Карціна ажыўляе вядомы з дзяцінства сюжэт, удала прыстасоўваючы яго пад сучасны кінабізнэс. Алімпійскія багі — фальшывыя і падступныя істоты. Цямця-лямця Зеўс (Лаям Нісан), попельна-белы забойца Аід (Ральф Файнз), жаночыя боствы з рэкламна-бліскучымі зубкамі. Людзі ж выглядаюць зусім непераканаўча.

Урэшце Персея зробяць богам. А ён будзе даводзіць на галівудскім Алімпе, што ён чалавек.

**Андрэй Расінскі**

## КАНЦЭРТЫ

### «J:морс» — усе хіты

**21 красавіка ў к/з «Мінск»** гурт «J:морс» прадставіць праграму «10 год — усе хіты». **Пачатак а 19-й.**

### Менестрэлі XXI стагоддзя

**28 красавіка ў Мінску ў зале імя Рыгора Шырмы Белдзяржфілармоніі** прагучыць канцэртная праграма «Менестрэлі XXI стагоддзя». Выканаўцы: квартэт блок-флейт **«Brevis»**, трыа **«Вытокі»**. У праграме — шэдэўры старадаўняй беларускай і заходнееўрапейскай музыкі: творы Агінскага, Баха, Гендэля, Ельскага, Моцарта, а таксама музыка XV—XVI стст. з Віленскага і Полацкага сшыткаў. **Пачатак а 19-й.**

### Дастыш фантастыш — Вольскі, Хітрык, РСП

**23 красавіка ў «Рэактары» (вул.Харужай, 29)** — канцэрт з нагоды выхаду фільма «Дастыш фантастыш». Бяруць удзел: **«Крамбамбуля»**, **«Дзецідзяцей»**, **«Разбітае сэрца пацана»**, **Naka**.



## ІМПРЭЗЫ

### Мінская Вясна-2010

Музычны фестываль «Мінская Вясна-2010» сёлета прысвечаны 200-годдзю з дня народзінаў Фрыдэрыка Шапэна і Роберта Шумана. **У Філармоніі 21 красавіка** — канцэрт фартэпіяннай музыкі. За раялем — Барыс Блох. **22 красавіка** выступаюць Кірыл Родзін і Міхаіл Аляксандраў. **24 красавіка** — трыа **«Kaskados»** (Літва). **Пачатак а 19-й.**

### «Ў нескладовае» ў «Рэактары»

**23 красавіка ў «Рэактары»** адбудзецца першы канцэрт сольнага праекта гітарыста Рамана Арлова «Ў нескладовае». Гэта спробы паказаць свет, які атачае нас, праз музыку і вершы. Падмурак праекта — беларуская мова. Матор праекта — беларускі рок-н-рол.

### «Дні Беларускага слова» ў Маскве

**21—22 красавіка** — Міжнародны фестываль «Дні Беларускага слова» ў Маскве. Праграма фестывалю: **21 красавіка: 16.00** — круглы стол «Расійская і беларуская літаратуры: актуальныя праблемы ўзаемадзеяння»; 19.00 — лірыка BY: творчы вечар Адама Глобуса. **22 красавіка: 16.00** — адкрытая лекцыя Валянціна Акудовіча «Беларуская культура — свабодная прастора»; **19.00** — вечар беларускай паэзіі і прозы. Бяруць удзел: Віктар Жыбуль, Альгерд Бахарэвіч, Вольга Гапеева і інш.

# Манэ і Будэн у Мастацкім

У Мастацкім музеі (Леніна, 20) ідзе шыкоўная выстава сусветнага мастацтва «Нармандыя ў жывапісе». Манэ, Будэн, Каро, Курбэ…

## Непадробныя і ў падобным

Нармандыя — не Італія. Росквіту прыроды тут прапаганаваная прыгажосць: шэрая расліннасць, пустэльныя пляжы, мітусня працоўных портаў, а таксама бясконцае неба, паветра (якое таксама мае колер) і занебакрайныя абсягі. Аднак гэтая частка Францыі зрабілася крыніцай натхнення для мастакоў з усяго свету.

Вянчаюць выставу карціна Клода Манэ «У Эртрэцэ» і тры працы прадвесніка імпрэсіянізму, Эжэна Будэна. Так, тут не самая знакамітая праца Клода Манэ, які падчас сваіх вандровак па Францыі толькі ўбіраўся з пер'е. На карціне — толькі спроба знайсці свой штрых пад нярким сонцам Нармандыі. Але гэта непаўторная спроба.

## Гатовы рэцэпт поспеху

Канцэпцыя аднайменнай, напалову дзяржаўнай, напалову прыватнай калекцыі «Нармандыя ў жывапісе» — простая. Але выстава, створаная ў 1992 годзе, аб'ехала еўрапейскі кантынент і ЗША, прэзентуючы Францыю і яе мастацтва. Няважна, ці тварыў мастак у XVIII ст. ці ў XX, быў ён імпрэсіяністам або кубістам, французам або амерыканцам. Галоўнае — адметны мастацкі погляд на нармандскі краявід.


Клод Манэ «У Эртрэцэ»

Палессе — не Італія. Хараству буяння і роскіту прыроды тут прапаганаваная манатонныя шыхты дуброваў, аднастайнасць пушчаў і ўсё ж магічнае палескае неба. Так, Палессе — не Італія, але яго краявіды натхнілі цэлы сонм мастакоў: Жукоўскі, Вайсенгоф, Шышкін, Вашчанка, Бялыніцкі-Біруля, Цвірка…

Гледзячы на пустынныя краявіды французскіх імпрэсіяністаў, так і просіцца ідэя тэматычнай выставы і збору, якія б маглі прэзентаваць беларускае мастацтва за мяжою. Не пампезна-неахопная «Беларусь у мастацтве», а калекцыя жывапісу на адмысловую тэму, скажам, «Палессе ў жывапісе», якая магла б стаць візітоўкай нашай краіны, як тое зрабілі ў Францыі. А, паводле спецыялістаў, запаснікі айчынных музеяў не пустуюць.

Выстава «Жывапіс у Нармандыі» працягнецца да 25 мая. Цана квіткоў — 8 тыс., для студэнтаў — зніжка.

**Лявон К.**

# 12 правілаў здаровага кахання

**Перспектыўнымі лічацца тыя адносіны, якія абяцаюць быць доўгачасовымі і разам з тым прыносяць радасць абаім партнёрам. Такія стасункі грунтуюцца на прынцыпах так званага здаровага кахання.**

Амерыканскі псіхолаг Трэйсі Кэбат фармулюе панятак «здаровае каханне» — тое самае, што робіць чалавека шчаслівым, напаўняе жыццём, а не пазбаўляе спакою, сну і сілаў. Даследчык вызначае 12 асноўных яго прынцыпаў.

**1.** Калі два чалавекі завязваюць стасункі, жыццё кожнага з іх мусіць палепшыцца. Калі жыццё пагаршаецца або калі вы цягнеце адно аднаго ўніз, урэшце хтосьці апамятаецца і пакаідае сысці.

**2.** Нельга купіць каханне. Калі вы робіце гэта, не разлічвайце на тое, што выдаткі акупяцца.

**3.** Пазбягайце рэўнасці... Людзі і без таго схільныя да рэўнасці, бывае, што ім не хапае ўпэўненасці ў сабе, таму не варта свядома выклікаць гэтае пачуццё.

**4.** Пры здаровых стасунках абодва партнёры залежаць адно ад аднаго ў аднолькавай ступені.

**5.** Чалавек, які сапраўды кахае, не патрабуе ад партнёра доказаў узаемнасці. Ён сам даказвае яму сваё каханне.

**6.** Сцеражыцеся жадання перайначыць партнёра. Калі вы ператтвараеце партнёра ў іншага чалавека, памятайце, што, магчыма, гэты новы чалавек не захоча застацца з вамі.

**7.** Чалавека, схільнага да дэпрэсіі, цяжка кахаць. Каханне мусіць рабіць чалавека шчаслівым, але знаходжанне вашага выбранніка побач яшчэ не гарантуе вам шчасця. Толькі вы самі здольныя рабіць сябе шчаслівым або няшчасным.

**8.** Жанчына хоча думаць, што яе любіць чароўны прынц, а не хворы псіх. Мужчыны таксама не любяць істэрычак і так званых бомбаў запаволенага дзеяння, якія могуць выбухнуць у любы момант. Непрадказальнасць партнёра расхіствае нервы і забівае пачуцці гэтак жа, як нудзіць поўная прадказальнасць.

**9.** Каханне, якое выбухнула імгненна, хутка вычэрпвае сябе.

**10.** Калі партнёр зразумеў, што з вамі можна кепска абыходзіцца, пераканаць яго ў адваротным будзе вельмі цяжка.



**11.** Завязваючы адносіны, варта ўстрымлівацца ад дзеянняў, якія патрабуюць занадта вялікіх намаганняў або выдаткаў і дэманструюць вашу залішнюю зацікаўленасць. І тое, і другое альбо хутка абясцэньваецца, альбо адразу адпалохвае.

**12.** Людзі адчуваюць сябе найбольш камфортна з партнёрамі, роўнымі ім па сацыяльным статусе, але якія пры гэтым з'яўляюцца псіхалагічнымі антыподамі. Іншымі словамі, каб выйсці замуж за прынца на белым мерсэдэсе, трэба быць прынцэсай у чырвоным паршэкабрыялеце. Вашы жыццёвыя каштоўнасці павінныя супадаць.

Псіхалагічны антыпод будзе стабілізаваць ваш душэўны стан. Экстраверту патрэбны інтраверт, песімісту — аптыміст.

Калі на этапах завязвання адносінаў партнёр парушае адзін або некалькі прынцыпаў, ад гэтага чалавека варта трымацца далей, пакуль вы не паспелі трапіць у залежнасць ад доўгачаканага, але ад пачатку бесперспектыўнага пачуцця.

# Сезонная алергія: вясна, азмрочаная слязьмі

Прычына з'яўлення сезоннай алергіі — пылок розных раслінаў: дрэваў, траваў, злакавых, складанакветных, споры некаторых грыбоў. Людзі, якія пакутуюць на алергію, часта прачынаюцца ўначы праз дыскамфорт, удушша. Некалькі такіх начэй — і ў вас ужо парушэнне сну. Узнікае нервовасць, раздражняльнасць, 2—3 бяссонныя ночы могуць развіць у вашага дзіцяці істэрыю або гіперактыўнасць.

### Наступствы захворвання

З алергіяй жартаваць не варта. Калі алергічны працэс запусціць (а многія так і робяць), можа ўзнікнуць ужо больш сур'ёзная рэакцыя ў выглядзе бранхаспазму, інакш — бранхіяльнай астмы.

### Пакуты з сярэдзіны вясны і да канца лета

Сезонныя алергічныя рэакцыі з'яўляюцца з першым пылком дрэваў, дзесьці з сярэдзіны красавіка. У сярэдзіне ліпеня эстафету прымаюць складанакветныя травы. І мучаюць схільных да алергіі практычна да першага снегу. Канцэнтрацыя алергенаў у паветры не залежыць ад часу сутак. Мае значэнне сам перыяд квітнення раслінаў, якія выклікаюць раздражненне.

### Дзе лепш жыць алергікам?

Калі вы пакутуеце на сезонную алергію і пры гэтым жывяце паблізу ад лесапаркавай зоны,



у якой пераважаюць ліставыя дрэвы, вы будзеце горш пераносіць перыяд апылення чым, скажам, у зоне, дзе растуць хваёвыя дрэвы.

### «Шкодныя» дрэвы

Першае месца сярод алергенных, «шкодных» дрэваў займае бяроза, потым ідуць вольха, ляшчына, клён, ясень.

Славутая таполя, якую абвінавачваюць усе і ва ўсім, наогул не выклікае алергіі. Насамрэч падчас выспявання яе пуховак (а гэта пачатак лета) пачынаецца перыяд квітнення злакавых траваў. Пухоўкі ж проста збіраюць астатні пылок з дрэваў і пылок злакавых траваў.

### Што яшчэ можа дапамагчы ад сезоннай алергіі

Важнае значэнне мае клімат: калі чалавек з'язджае ў той рэгіён, дзе пыленне ўжо прайшло, ён спакойна пераажывае гэты перыяд. Можна паспрабаваць зменшыць уздзеянне алергенаў, усталёўваючы ачышчальнікі паветра, чысцячы дываны штодня, падтрымліваючы пэўную вільготнасць у кватэры, але часта гэта не мае эфекту або патрабуе празмерных фізічных і матэрыяльных выдаткаў. У перыяд квітнення можна насіць ватна-марлевыя павязкі, асабліва падчас працы на дачных участках. Трымайце дзверы і вокны зачыненымі, усталюйце на акно спецыяльны паветразаборнік з антыалергенным фільтрам. Пазбягайцеся ад дываноў. Пачынайце прымаць прафілактычныя прэпараты за некалькі тыдняў да асноўнага квітнення раслін.

Памятайце: доктар найлепей можа вызначыць, што з'яўляецца для вас алергенам і як лячыць праявы алергіі. Паведаміўшы доктару дэталёвую інфармацыю пра свой лад жыцця і звычкі, вы дапаможаце яму дакладней вызначыць праблему і параіць вам, як даць рады праявам алергіі.

**Паласу падрыхтавала КаМ**

# Кемікі



1. Пад трыма лавамі сядзела па тры каты. Колькі ў іх ног?

2. Што бывае з козлікам, калі яму споўніцца шэсць гадоў?

3. Дзе акіяны без вады, моры без вады, а гарады без людзей?

4. Чаму лебедзі да возера ляцяць?

5. Ці можа акула назваць сябе рыбай?

6. У што б'юць цвікі, калі дом будуюць?

7. Пералічыце пяць дзён запар, не называючы назваў дзён тыдня і лічбаў.

8. Гарэла 5 свечак. Чатыры патушылі. Колькі засталося свечак?

9. Несла дзяўчынка ў кошыку дваццаць яек. А дно ўпала. Колькі засталося яек?

10. На стол на ўсе чатыры вуглы паставілі вазы з кветкамі. Супраць кожнай вазы па тры вазы. Колькі ўсіх вазаў з кветкамі паставілі?

# Прыватныя абвесткі

### ЗДЫМЕМ АДНАПАКАЁЎКУ

**Беларускамоўныя** хлопец з дзяўчынаю здымуць у Мінску аднапакаёвую кватэру. Прапановы прымаюцца на нумар: (029) 782–88–81.

### ПРАДАМ

**Драўляныя зашклёныя аконныя рамы** б/в, танна. Т.: (029) 570–80–88.

### КУРСЫ МОВЫ І ГІСТОРЫІ

**Запрашаем** на бясплатныя заняткі па беларускай мове і гісторыі для школьнікаў 7–х — 9–х класаў. Заняткі праводзяць вядомыя педагогі, кандыдаты навук, выдатнікі адукацыі Беларусі. Заняткі праходзяць кожны аўторак ад 16.00 да 18.00 у памяшканні ТБМ (Мінск, Румянцава, 13, ст.м. «Плошча Перамогі»). Даведкі праз т.: (017) 284–85–11, (029) 639–27–15.

### СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ

**Запрашаем** у падарожжа Прага—Дрэздэн 13—17 траўня. Т.: (017) 292–54–58; (029) 622–57–20; (029) 509–12–16.

**Запрашаем** у сяброўскае падарожжа па лідскім наваколлі 2 мая па маршруце: Вавёрка—Белагруда—Тарнова—Нецеч—Беліца—Дзікушкі—Голдава—Радзівонішкі.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## Сапраўдная беларуская кухня

### Паклічма сяброў на кактэйлі!

Вясна... Сонейка, добры настрой. Ва ўсю цвітуць сетчатыя ірысы і крокусы, пад запаветным дубам зямля блакітная ад плямачак пралесак, няструмна пруць з зямлі цюльпаны (дарвінаўскія гібрыды) і падымаюць галоўкі нарцысы, раскашуе белая сцыла, а ў зацішным куточку саду ціхенька зацвіла гусіная цыбулька... Давай падзелімся настроем — давай паклічам сяброў на кактэйлі!

Кактэйлі, як ніякія іншыя напоі, спрыяюць таму, каб з бакалам у руках гуляць па зялёным мурагу і захапляцца нязломнасцю жыцця ў кампаніі добрых сяброў — такіх жа нязломных, як само жыццё.

Спецыфічных беларускіх кактэйляў пакуль не вынайдзена, такім чынам, зробім для сяброў тое, што па строгіх, зацверджаных рэцэптах робіцца па ўсім свеце на працягу ўжо больш як 100 гадоў.

Хаця, чаму па такіх ужо строгіх? Тут ёсць наш беларускі сакрэт: хаця для многіх класічных рэцэптаў патрабуюцца напоі, якія ў нас каштуюць зашкальна дорага, іх смела можна замяніць больш даступнымі: вермут «Марціні» — любым іншым добрым вермутам, тэкілу — гарэлкай добрай ачысткі (напрыклад, «Генерал»), лікёры «Куантро» і «Кюрасаа» — іншымі апельсінавымі лікёрамі. Смак будзе не горшым!

**«Маргарыта»**



40 мл тэкілы, 15 мл лікёру «Куантро», 15 мл лімоннага соку, 2—3 кубікі лёду, соль для «шэрані»

У шэйкеры змяшаць усе інгрыдыенты з кубікамі лёду і працадзіць у кілішак, ахаладжаны і заўчасу абляманы «шэранню» з солі.

Зрабіць «шэрань» можна так: край кілішка злёгку змачыць вадой або лімонным сокам, а затым перакуліць у насыпаную тоўстай варствай соль буйнога памолу.

**«Манхэтэн»**



40 мл віскі бурбон, 20 мл вермуту, 3—4 раскрышаныя кубікі лёду, вішанька

У шэйкеры перамяшаць віскі і вермут, дадаць раскрышаныя кубікі лёду і працадзіць у ахаладжаны кілішак для кактэйляў.

**«Марціні»**



40 мл джыну, 20 мл вермуту «Марціні», 3—4 кавалачкі лёду

Змяшаць усё ў шэйкеры, падаць у кілішку для кактэйляў, прыкрасіўшы аліўкай.

**«Паміж старонкамі»**



30 мл брэндзі, 20 мл белага рому, 20 мл «Куантро», 10 мл лімоннага соку, 3—4 кубікі лёду, вішанька.

У шэйкеры змяшаць усе інгрыдыенты з кубікамі лёду і працадзіць у кілішак для кактэйляў. Прыўкрасіць вішанькай.

**НБ**

# Вясна. Звальненне...



PHOTO.BYMEDIA.NET



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Вядоўца праграмы «Музычны суд» на АНТ Саша Паўлава атрымала адну з сёлетніх прэмій «Тэлевяршыня». А суддзі хто? Суддзямі былі кіраўнікі Міністэрства інфармацыі і тэлеканалаў. Гран-пры ж яны аддалі адразу двум праектам: праекту БТ «Снайпер. Зброя Перамогі» і «Міс Інтэркантынентэль» канала АНТ.**




**Усё ж, насуперак надпісу, кандыдат — справа. Іншыя кур'ёзы мясцовых выбараў — старонка 8.**



**Вось такая марыянетка кіраўніка беларускай дзяржавы прадавалася падчас Берлінскага кінафэсту. У бардзо пажонднай кампаніі.**







**Ва Уладзівастоку (Расія) паступіла ў продаж туалетная папера з выявамі сатырыка Міхаіла Задорнова. Так жыхары горада адрэагавалі на яго параўнанне мясцовых жанчын з прастытуткамі ў адным з выступаў.**

## Анекдоты

* * *

— Мужчыну, вядома, працей. Ён павінен зрабіць тры рэчы: пасадзіць дрэва, збудаваць дом і нарадзіць сына. І яму зусім не важна, хто пасля ўсё жыццё выхоўвае сына, палівае дрэва і прыбірае той дом.

* * *

Бяда адна не ходзіць. Звычайна яна з'яўляецца разам з участковым і кажа:

— А я ж цябе, зяцёк, па-добраму папярэджвала...

* * *

Дзве сяброўкі.

— Як ты прывучыла свайго мужа раней вяртацца дадому?

— Вельмі проста. Прыходзіць ён у чарговы раз за поўнач, а я і гукаю з пакоя: «Вася, гэты ты?»

— А ён?

— А ён Алесь.

* * *

Аб'ява: Шукаю працу ў офісе. Навыкі: падчас праверак магу з'есці любую дакументацыю ў любой колькасці.

* * *

— А вы ведаеце, што Робін Гуд забіраў грошы ў багатых і аддаваў бедным?

— А на што ж ён жыў?

— На працэнты!

## «НН» сто гадоў з вамі

**Магілёў.** Праз увесь сакавік аж да апошніх часоў праз Магілёў цягнецца шмат мужыкоў-беларусаў з усімі сваімі манаткамі ў Сібір. Па колькі начэй, чакаючы свабодныя месцы на машыне, валяюцца яны на падлозе, не раўнуючы, як дровы. Бедныя людзі!

**«НН». №15. 1910**

Прэзідэнт ЗША Біл Клінтан назваў імя новага амерыканскага пасла ў Беларусі, які ў чэрвені зменіць на гэтай пасадзе Дэніэла Спекхарда. Да нас прыедзе Майкл Козак (Міхась Казак, па-беларуску), які да нядаўняга часу ўзначальваў амерыканскую місію ў Гаване. Файна, калі пасол з паходжання наш зямляк, але краіна яго ная папярэдній дыслакацыі — Куба — лішні раз сведчыць пра цяперашняе месца Беларусі ў свеце.

**«НН». №15. 2000**

**Адказы да старонкі 15:**

1. Ніводнай, бо ў іх лапы. 2. Пойдзе сёмы. 3. На карце. 4. Возера да лебедзяў не ляціць. 5. Не, таму што гаварыць не ўмее. 6. У плешкі. 7. Пазаўчора, учора, сёння, заўтра, паслязаўтра. 8. Чатыры. 9. Ніводнага, бо дно ўпала. 10. Чатыры.

**Наша Ніва**
незалежная газета

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф-рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Мінск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА.** Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.

**Наклад 6320.** **Газета выдаецца 48 разоў на год.**
Нумар падпісаны ў друк 23.00 20.04.2010.
Замова № 1912.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
ISSN 1819-1614